Постаці

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч

SHOUT
SHARE
IT

- Уладзімір Караткевіч
  - Вера ў сілу дабрыні, або Сын Беларусі, сын Прагі
  - Зліццё з душой народнай
  - Князь і гусляр
  - Летапісец
  - Мой друг і мая зямля
  - Пакуль гэта сэрца б'ецца
  - Рыгору Раманівічу Шырме — сардэчныя словы любові
  - Слова пра Шолахава
  - Узыход на вяршыні
  - Цёплы жнівеньскі поўдзень
  - Шляхі ў палях

Уладзімір Караткевіч
Постаці

Вера ў сілу дабрыні, або Сын Беларусі, сын Прагі

Ёсць на свеце гарады, якія, з самага пачатку, радасна і балюча раняць тваё сэрца. Або, калі выславіцца іначай, заражаюць тваю душу вечную тугою па сабе. І не толькі тваю душу. Усякую.

Прага — адзін з такіх гарадоў. Я думаю аб ёй як многія і многія тысячы людзей восемсот… чатырыста… сто год назад… зараз. Я ўжо ведаю, што ніколі не здолею адкінуць думку аб ёй, што гэты горад будзе вечна і ўладна прыцягваць мяне да сябе. І як першую даніну маёй новай (і старой) любові да яго, я хачу прынесці яму сціплае апавяданне аб адным чалавеку, для якога ён стаў другой духоўнай радзімай.

Аб Францыску Скарыне (каля 1490 — каля 1551 гг.), вялікім беларускім першадрукары, асветніку, вучоным, мастаку. Першым сярод усходніх славян доктары медыцыны. Першым (значна раней за Лютара) перакладчыку "Бібліі" на мову простага чарнарукага народа.

Кніга "Быцця" — і асвета? Кніга "Царстваў" — і гуманізм? Ці не замнога мы бяром на сябе, называючы Скарыну асветнікам і гуманістам? Дзеля таго, каб адказаць на гэта, трэба зірнуць на эпоху, у якую жыў гэты чалавек.

Людзі нібы ачнуліся ад шматвекавога чаднага сну, у якім ледзь не памёрла самая ідэя Чалавека. Іхнія галовы яшчэ баляць рэлігійнымі догмамі і феадальнымі нормамі. Але лёгкія ўжо хапаюць свежае паветра, прагна, захлынаючыся, з той цягай да рэзкага, гаючага ветру, якая лепей за усё гаворыць, што Чалавек, што Чалавецтва будуць жыць, якія б Гернікі і Асвенцімы ні былі яшчэ суджаны ім на іхнім шматпакутным шляху.

З-за мораў плывуць караблі, гружаныя спецыяй і золатам, багацеюць і робяцца мацнейшымі за феадалаў гарады, з-пад рук рамеснікаў выходзяць рэчы, якія мы і зараз лічым шэдэўрамі. Як трава пасля доўгай зімы, паўсюль з'яўляюцца дзівосныя па багаццю талентаў людзі: паэты, дойліды, філосафы, інжынеры, мастакі.

І аднак, на думцы чалавека яшчэ вісяць кайданы. Царква паўсюль рэгламентуе гэтую думку (змянілася толькі тое, што думка болей не жадае пакоры і слухмяна цярпець гэта і, застаючыся рэлігійнай, прынамсі ў філасофскім аспекце, хоча мець права сумнявацца, мець права на ерась, мець права не ўсё браць на веру, нават калі гэта сказалі Майсей або Хрыстос).

Яшчэ паўсюль гараць жывыя факелы, і ў Англіі "авечкі з'ядаюць людзей", — але з'явіліся ужо Рабле і Леанарда да Вінчы, Томас Мор і Кампанела, Мюнцар і Гус.

Разгромлена войска Мюнцара. Пасля тытанічнай барацьбы з сіламі ўсяго свету прыдушаны рух гусітаў. Жыццё — як агонь і ноч: дзіўная сумесь гуманізму, які ўсё больш уладна разгараецца ў душах — і самага бессаромнага, трыумфуючага цемрашальства.

На беларускіх землях яшчэ горш. Большая частка людзей увогуле не прачнулася, не адчувае неабходнасці змен. Яны ўжо выраслі са старой вопраткі, але не саромеючыся носяць яе. Самыя перадавыя з надезяй глядзелі на Рэфармацыю, на гусіцкі рух, але цяпер страцілі надзею і яны.

Як пісаў пазней наш паэт Мікола Гусоўскі ў сваёй "Песні пра зубра":

Братазабойствы, грызня, міжусобныя
войны —
Іхні занятак фізічны і свет іх духоўны.
Б'юцца князі-ваяводы, а стогнуць
народы.
… … … … … … … … … … … … … …
Што ім той смерд — наша гора і нашы
пакуты?
І м свайго дамагчыся, а ты хоць заліся
У горкіх слязах. За мурамі рыданняў
не чутна…
… … … … … … … … … … … … … …
Што ім значыць клінком мацярынскае
лона
Выпусціць разам з маленькім? Усё ж
па загаду:
Сродкі — любыя, а мэта адна —
вынішчэнне.
… … … … … … … … … … … … … …
…ён і не дбае, што голыя рукі
адпомсцяць.
Стогне і ў цемрадзі ночы злавеснай
народ наш
Вобмацкам долі шукае. Жахлівыя здзекі…
… … … … … … … … … … … … … …
Князь і баяры — усе, каму льга
заступіцца,
Глухі да нас і не горай, чым жорсткі
татарын,

Душаць пятлёй галасы абурэння
ў народзе.
Плаха і кат-выканаўца — вось доля
любога,
Хто пастаяць за закон і за бога азваўся.

Рэфармацыя таксама пачала паліць людзей. Гусітам не удалося збудаваць "царства божае" на зямлі. Свае бунтары пайшлі на плаху. Надзея ўжо нават не на бога — што ён зрабіў добрага? — а на дзеву Марыю.

Вымаліць краю тваю абарону-спагаду.
О, заступіліся за нас! Праз любоў
к чалавеку
… … … … … … … … … … … … … …
Ты наша маці-заступніца, мы — твае
дзеці,
Крыўдзяць, цкуюць нас і ганьбяць —
утры нашы слёзы.
… … … … … … … … … … … … … …
Нашым князям, што ў сваіх міжусобіцах
розум
Нашай крывёй замуцілі, падай
на пахмелле…
Цемра. Надзеі няма. Дабро стаптанае.

У такі час трапляе ў Прагу Францыск Скарына, сын купца з горада Полацка.

Полацк у той час вялікі і багаты. Ён плаціць каралю падатку ледзь не больш за усе гарады княства. У ім сыходзяцца артэрыі гандлёвых шляхоў, на вулках чуваць нямецкая, дацкая, італьянская мовы. Затое слаба гучыць сярод вярхоў беларуская мова і, галоўнае, беларуская думка.

Насоўваецца нешта трывожнае. Раней нікога не ганялі за чытанне "ератычных" італьянскіх, нямецкіх і сваіх рукапісаў. Раней была цярпімасць. Калі ў 1413 годзе ў Полацкую епархію і Віцебск прыехаў славуты Іеранім Пражскі і прапаведваў ідэі Гуса — ніхто не перашкаджаў яму рабіць гэта, і ідэі прапаведніка з Гусінца набылі ў Полацку і Віцебску папулярнасць, іх слухалі і князь, і просты народ (мог слухаць іх і дзед Скарыны).

А тут пачыналася нешта дзіўнае. Пасеў быў зроблены. Рунь выйшла наверх. І тут жа гэтую рунь пачалі па-вар'яцку таптаць. Замест цярпімасці — барацьба нацый, вер, моў, паляванне за

ведзьмамі. І ўжо справа ідзе аб тым, ці будзе народ маліцца, як ён хоча, дыхаць, нават проста жыць.

І народу гэтаму, галоўнае, няма адкуль даведацца аб "праўдзе" і аб "праўдзівым богу". Мала, вельмі мала кніг. Кнігі — рукапісныя. Кніга — гэта вельмі дарагая маёмасць. Кніга дарэмна займае месца ў багатых палацах, дзе ў яе не заглядаюць. Кніга ў корані не дэмакратычная.

І, магчыма, яшчэ ў той час зараджаецца ў душы юнака думка пра кнігу адносна танную, даступную, кнігу, якую мог бы трымаць у руках кожны і разумець — кожны. Кнігу на роднай мове. Не на латыні, не на стараславянскай (абедзве незразумелыя і абедзвюма клірыкі адгароджваюцца ад простага народа, каб і далей лічыў кніжную прамудрасць дарам божым, іх, клірыкаў, людзьмі асобай, вышэйшай пароды, а сябе — няздатнай ні на што жывёлай, якой так і суджана век пражыць у цемры).

На роднай. Тут у Скарыны няма сумненняў. Пасля, у прадмове да адной з кніг сваёй "Бібліі", ён скажа, што выдае кнігі на простай мове таму, "Ізэ мя літасцівы бог з той мовы на свет пусціў".

Пачынаецца шлях. На ўсё жыццё. Упарты, настойлівы. Вечны паход, вечная вайна за веды і культуру. Па гразкіх дарогах радзімы, па дарогах чужых краін. Пад дажджом, пад пякучым сонцам, пад навальніцамі і снегам. Праз непрыхільнасць, недавер, жорсткасць, падазрэнні. Нават праз смерць.

1504 год. Юнак у Кракаўскім універсітэце Ягелонаў. На факультэце свабодных мастацтваў. Гэта часы Каперніка. Гэта рэнесанс навукі і мастацтва, адраджэнне чалавечых душ, іх выйсце з пекла, у якім гінуў сам дух.

5 лістапада 1512 года. Падуя. Храм святога Урбана. Віцэ-прыёр Тадэй Мусаці паведамляе вучоным мужам медыцынскай калегіі універсітэта аб тым, што "вучонейшы юнак, доктар навук, бядняк з вельмі далёкіх краін, можа, за тысячы з чымсьці міль ад гэтага славутага горада, дзеля павелічэння славы і чэсці яго, а таксама гэтай слаўнай гімназіі… прыбыў сюды і жадаў бы… атрымаць ступень доктара медыцыны бяскоштна, па спецыяльнай міласці і з ласкі божай".

Ён адказваў "настолькі выдатна і бездакорна" (а экзамен быў "строгі"), такімі "бліскучымі доказамі", што "ўсімі наяўнымі дактарамі, пры поўнай адсутнасці нязгодных" быў "абвешчаны доктарам лекарскіх навук".

Што прывяло яго ў Італію? А тое, што пазней прывяло ў Прагу. Дух універсітэта пранізваў і вызначаў усё ідэйнае, усё духоўнае жыццё і Падуі, і Прагі. І гэта быў тып менавіта "італьянскага ўніверсітэта".

Не бурсы, што смярдзіць капустай і запляснелымі ідэямі, і не манашая школа, а, хай сабе і не да канца вольная ад даўно струхнелых думак Аўгусціна Блажэннага, — усё ж гуманістычная школа, у якой, перш за ўсё, кажучы словамі Дантэ, цанілася "доблесць і веды", а не бяздумнае наследаванне закасцянелых царкоўных догмаў. Лозунгам Падуі, лозунгам Прагі ў той час магло быць: "за розум, веды, праўду супраць догмы, супраць хлусні, супраць двух бакоў аднаго медаля: пакоры і несправядлівасці".

Дык вось. Прага. 1517 год. Менавіта ў гэтым горадзе ён надрукуе сваю "Біблію" на старабеларускай мове. Яшчэ задоўга да таго, як выйдзе нямецкая біблія Лютара.

Дзе Скарына правёў пяць гадоў пасля Падуі? Мы не ведаем. Але гэтыя гады, несумненна, не прапалі. Чалавек рыхтаваўся да галоўнай справы жыцця. Напэўна, у гэтыя гады і быў ім зроблены пераклад, таму што пазней, у Празе, за ўсімі друкарскімі, арганізацыйнымі, грашовымі клопатамі на гэта проста не хапіла б часу.

Прага тых часоў. Яе змрочны і прыземлены раманскі пачатак з цэрквамі, падобнымі на пячоры, высечаныя ў скале. І працяг. Нібы сам дух чалавека выбухнуў у неба і пачаў выстрэльваць у яго стрэламі непараўнальнай Пражскай готыкі.

Лесвіца Іякава. Людзі раптам нібы пачалі разумець, што не адным анёлам узыходзіць па ёй на неба, што могуць і яны, пражскія мяшчане, з хітраватым розумам у вачах, аматары выпіць і пад'есці: піва льецца ў глоткі, бы ў апраметную, кавалкі шынкі падаюць туды ж, як са страхі.

Але ён бачыць галоўнае, бычыць тое, што зрабілі чорныя, жорсткія, як капыты, рукі гэтых людзей: грубыя муры будынкаў і найтанчэйшы аксаміт, мячы і карункавую работу па дрэве і злату.

Гэтыя яму дапамогуць, ён ведае. Дапамогуць зрабіць па ягоных малюнках дрэварыты (і на іх будуць "біблейскія" героі ў старабеларускіх, — аднак і з элементамі чэшскай гарадской вопраткі пачатку XVI ст., - адзеннях), дапамогуць адліць шрыфт, дапамогуць дастаць з Германіі дэфіцытную паперу, патрэбную, як паветра, тую з Аугсбурга, з вадзяным знакам у выглядзе галавы быка.

Памогуць яго палкаму жаданню прынесці свайму народу святло, зрабіць яго хаця крыху шчаслівейшым.

І памаглі. І ўжо ёсць друкарня. Можа быць, што напаўлегальная (гарадскія акты не ўпамінаюць аб месцы, дзе яна была). І гэта зразумела. У вясёлай "добрай, старой Празе" завялася рэлігійная падазронасць. Семдзесят дзевяць год таму задушаны гусізм і, напэўна, самая памяць пра божых воінаў, пра

рыцараў волі крыху прыаслабла ў людзях, прыціснутых усобіцамі і сваркамі князёў. Жыве яшчэ шмат людзей, што памятаюць караля Іржы з Патэбрад, але яны памятаюць і ягоны лёс, і, што казаці, ад гэтых успамінаў ім крыху не па сабе. Краінай правяць — і доўга яшчэ будуць правіць — людзі, якім мала справы да чэшскай мовы і культуры, да гордага духу чэшскага народа. А не за гарамі і час Габсбургау. Спачатку мяккія лапкі, а потым сталёвая песць, якая стагоддзямі будзе імкнуцца выдушыць з чэхаў мову, самасвядомасць і веру ў свае сілы, каб самое імя "чэх" знікла з твару зямнога.

Скарына яшчэ ўбачыць гэта. І вялікі пажар Малай Страны, Града і Градчан, і страшны час, калі Фердынанд I пазбавіць пражан палітычных правоў. Многа, ой, многа яшчэ давядзецца яму пабачыць!

Але пакуль Прага ёсць Прага. І ідзе набор. І гравёры рэжуць дошкі для гравюр, і часам робяць гэта цераз пень-калоду, можа, напіўшыся піва — падумаць толькі, у сцэне жніва да кнігі "Руф" усе жняцы трымаюць сярпы ў левай руцэ! Краіна ляўшноў! — але часцей за ўсё так добра, што скарынінскія гравюры будуць лічыцца шэдэўрамі аж да нашых дзён.

Прага ёсць Прага. Ажыўленая, гандлёвая і рамесніцкая, моцная залатымі рукамі майстроў, культурнымі традыцыямі, навукай і кніжнасцю. У ёй малады вучоны (яму яшчэ толькі каля дваццаці сямі год) адчувае сябе, як рыба, якую ўрэшце пусцілі ў ваду. Ён ўрэшце дыхае на поўныя грудзі паветрам горада. Ён бачыў Полацк з непараўнальнымі Сафіяй і Ефрасінняй, бачыў суровы, мужны воблікам Кракаў і Падую. Але Прага, несумненна, цудоўнейшы з гарадоў, у якіх яму даводзілася жыць. Не такая, як зараз, але, несумненна, ужо "Злата Прага".

Ён любіць яе. Яму тут лёгка жыць і працаваць. Лёгка рэгуляваць вінт станка, лёгка сварыцца з рабочымі, лёгка праводзіць бяссонныя ночы над рэдагаваннем тэксту або пісаннем прадмоў да кожнай кнігі.

Лёгка нават проста блукаць начнымі вулкамі і піць прыгажосць горада.

Што ён мог бачыць?

Карлаў мост, такі ж велічны і гожы, хіба што без статуй, з адным толькі старым распяццем. Але ж Влтава плыла і тады, як цяпер, варушачы косы водарасцей і адбіваючы нясмела першыя праменні сонца.

Складаную блытаніну раманскіх і гатычных будынкаў, у якую, пакуль што яшчэ вельмі нясмела, украдваўся ранні рэнесанс (да базілікі святога Іржы толькі нядаўна прыбудавалі рэнесансны франтон, і пачалі перабудоўваць "дом Фауста").

Так жа узносіўся ў палымнеючае вячэрняе неба храм святога Віта з зазубранымі, як хвост ската, шпілямі, што, здаецца, пранізваюць самое неба. Так жа звіваліся грэшнікі на мазаіцы "Страшнага суда". І, самае галоўнае, ужо пятнаццаць год блытанінай сваіх гатычных скляпенняў адгароджаў ад астатняга свету свой нязмерны абшар, у якім хоць на конях ганяй, Уладзіслаўскі зал.

Як і цяпер, узносіліся ўгору Чорная вежа і Даліборка і жорстка зранены гусіцкімі войнамі Страгаўскі манастыр. Увесь у шрамах, што раздзерлі яго прыгожае цела.

І чорны гмах Прашнай брамы, якая (падумаць толькі!) тады яшчэ не была Прашнай, і была позне-, а не псеўда-гатычнай. І, ясна ж, Каралінум, — тады ячшэ гатычны, як і Старамесцкая плошча — духоўнае сэрца горада, у якім сядзяць езуіты, але веды і цяга да іх у студэнтаў застаюцца ранейшымі.

Мне толькі страшэнна шкада, што ягоныя вочы не ўбачылі аднаго з самых вялікіх дзіваў на зямлі: Златай вулачкі. Не ўбачылі цацачнага рознакаляроўя яе домікаў, комінаў, усёй гэтай каменнай поліфаніі, якая кажа нам аб жыцці сярэдневякоўя куды больш, чым многія славутыя храмы.

Аб звычайным няяркім жыцці з будзённымі трывогамі, са сваімі маленькімі радасцямі і маленькімі перамогамі, з усім тым, чым і зараз жыве значная частка чалавецтва.

А ўрэшце, ён бачыў шмат таго, чаго, на жаль, ніколі не ўбачым мы.

Ён блукае вуліцамі. Добра думаецца пад спеў Пражскіх званоў. І добра ўспамінаецца пра родныя Полацкія званы.

Не, не, трэба спяшацца. Жыцця не хопіць на тое, што задумаў ён, Францыск Скарына. Такога кароткага, такога безабароннага перад нечаканасцямі і чужой злой воляй. Такога ўпартага, моцнага, нязломнага.

…Недзе на Старым Месце, у раёне Старамесцкай плошчы, па начах гарыць святло, звяраюць тэкст будучай кнігі з "Бібліяй" на стараяўрэйскай, грэчаскай і лацінскай мовах. І, перш за ўсё, з чэшскай "Бібліяй" 1506 года.

На Скарынавы далоні лёг першы, вільготны і ліпкі ліст. Першы з многіх і многіх тысяч. 23 кнігі. З прадмовамі, каментарыямі, застаўкамі і гравюрамі. І ўсё гэта яго работа.

Нейкая горкая іронія ёсць у тым, што ён пачаў выдаваць "Біблію" з "Кнігі Іава". Нібы прадбачыў свой нялёгкі шлях. Нібы ён, вялікі вучоны, вялікі мастак і пісьменнік, загадзя ведаў свой лёс. Урэшце, гэткае падсвядомае прадчуванне не такая ужо рэдкая рэч на зямлі. Іржы Волькер прадчуваў сваю раннюю смерць, і Карэл Маха ў сваім "Маі", і Пушкін у сцэне смерці Ленскага, і наш

Максім Багданавіч.

Скарына быццам адчуваў, што ён, як чалавек з "зямлі Уц, імя якому было Іаў", усё жыццё будзе рызыкаваць самім жыццём, будзе цягнуцца па "крутых чужых сходах", як Дантэ, што яго будуць праклінаць, што супраць яго справы будуць такія ворагі, як папа і Лютар, маскоўскія патрыярхі і свае дабрадзеі.

І, аднак, ён ідзе. Ён верыць у дабро, і яго вядзе па цяжкіх шляхах толькі адно:

— Дайце асветы майму народу. Дайце крыху болей асветы славянам. Тады іх, пісьменных, абазнаных, ніхто ўжо не здолее пакрыўдзіць, як крыўдзілі дагэтуль.

Так, прынамсі, лічыў ён.

Выходзіць кніга за кнігай, і кожная — маленькае дзіва паліграфіі. Вытанчаны, зграбны, чытэльны шрыфт, з выдумкай і густам зробленыя застаўкі і загалоўныя літары, выключныя па прыгажосці і якасці друку гравюры, якія ўражваюць і зараз, і якія можна разглядаць гадзінамі. Народу так патрэбна прыгажосць! Не менш, чым веды і хлеб!

Ён робіць таленавітыя кнігі. Ён проста не можа рабіць іншых.

І вось ужо ўсе яны ляжаць перад ім. Такіх яшчэ не было. І ўсё гэта зрабілі ягоныя рукі і рукі яго пражскіх сяброў.

Зрабілі самі, без нічыёй дапамогі, і гэта відаць не толькі па чыстай залатой мове, але і ў кожнай рысе гравюры, з якой паўстае славянскі тып ва ўсёй сваёй асаблівасці, дзе ўсё сваё: твары, вопратка, інтэр'еры, нават сам пейзаж. І кожны славянін, убачыўшы гравюру да "Руфі", успомніць цягучую жніўную песню над полем, мігценне каласоў у вачах, шастанне сярпа і, магчыма, прыпомніць, што і ён бачыў дзвюх бедных жанчын, якія падбіралі каласы за жняцамі, і сціснецца ў яго сэрца ад раптоўнай, вострай шкадобы да іх.

І ён убачыць гравюру да кнігі "Эсфір", і прачытае, і ўзненавідзіць здраду і подлыя падкопы каралёў супраць сваіх народаў.

І ўбачыць будаўніцтва Вавілонскай вежы і зразумее, што адзіная несумненная каштоўнасць і адзіная веліч на зямлі ёсць Праца, і яе няма чаго саромецца, а саромецца трэба таго, што ты жывеш з працы другіх, бо ўмееш прадаваць індульгенцыі і мянцець языком з амбона.

І ўбачыць Юдзіф з галавою Алаферна і зразумее, што няма на зямлі каштоўнасці большай, чым родны край, і калі ўжо жанчыны, рызыкуючы жыццём і гонарам, пайшлі дзеля яго на ўсё, то мужчынам і пагатоў трэба.

Так ён і напіша ў сваёй прадмове: "Понеже ад прыражэнія звери, ходяшчие в пустыні, знаюць ямы своя; птіці, летающіе по

воздуху, ведаюць гнезда своя; рібы, плывающчыя по морю і в реках, чуюць віры своя; пчолы і тым падобныя бароняць ульев своіх; така ж і людзі і где зродилися і ускормлены суць по бозе, к тому месту велікую ласку імаюць".

Шмат чаго ён яшчэ скажа. Скажа аб тым, што хрысціянства — не суды над іншамыснымі, а бяззлобнасць і браталюбства, што абраных богам народаў няма, што ўсе браты і няма розніцы між імі. Ён падыдзе да "Бібліі" рацыянальна, як да крыніцы ведаў граматычных, музычных, астранамічных. Як да таго, па чым можна вывучаць логіку, рыторыку, геаметрыю — усе не рэлігійныя, а свецкія веды.

Ён скажа аб антычна-дэмакратычным ідэале мудрага і справядлівага правіцеля, які не просіць сабе "ні дзён многіх, ні багацця, ні жэ душ ворагаў", а просіць "мудрасці", бо "без мудрасці… немагчыма добра жыць людзям простым на зямлі".

Ён будзе гаварыць аб праве і справядлівасці, аб "роўнасці для ўсіх", аб аднолькавым праве ўсіх на жыццё, хлеб, асвету і любоў.

Ён адмовіць царкве і царам у манаполіі на думку, у манаполіі іхняй улады над чалавечай думкай. І скажа, што ёсць законы прыроджаныя, а ёсць законы пісаныя, і перавагу трэба аддаваць першым.

І ён скажа гэта такой яснай і гожай, такой лаканічнай мовай, што яна і зараз шмат у чым з'яўляецца для нас узорам.

А, самае галоўнае, ён дасць народу зразумелую кнігу, а значыць і самасвядомасць, розум, шлях з сутарэнняў на святло.

…Пасля пачаліся гады вандраванняў. Родны сын Беларусі і прыёмны сын Прагі зноў пад рэзкім ветрам на бясконцых дарогах.

Бясконцая змена гарадоў. Вечныя спрэчкі з праваслаўнай і каталіцкай, з рэфармацкай догмамі. Частку ягоных кніг спалілі і ледзь не спалілі яго самога.

Але ён упарта выдае новыя і новыя кнігі. На гэты раз у Вільні.

…Але потым, відаць, адмовілі ў грашах на выданне новых кніг мецэнаты. Грашовае становішча Скарыны зусім не бліскучае. Пачаліся суды, страшнае сярэдневяковае кручкатворства, горы паперы, якая так была б патрэбна для кніг, для ягоных кніг. Той паперы, на якую ён звёў усе свае грошы і без якой заўсёды задыхаўся.

А пасля, як на Іава, пасыпаліся яшчэ і яшчэ няшчасці. Канфіскацыя маёмасці. Страшны Віленскі пажар 1530 года, у якім, відаць, згарэла і друкарня. І ўсё тое, што засталося. А пасля маравая язва, што выкатала амаль увесь горад, мортусы з завешанымі тварамі і бусакамі (баграмі) у руках. І гэтымі бусакамі цягнуць трупы і кідаюць іх у фуры, што цягнуцца ў начы, пры святле паходняў, вуліцамі прыціхлага, звар'яцелага ад жаху

горада.

Ён едзе ў Кёнігсберг, і хаця герцаг Альбрэхт лічыць яго ледзь не самым выдатным вучоным свету — пратэстанты хутка выжываюць яго адтуль. Ён едзе ў Маскву, каб друкаваць кнігі там — цемрашалы-царкоўнікі, якім не патрэбна зразумелая кніга, ствараюць вакол яго такую пякельную атмасферу, у горадзе так пачынае смярдзець вогнішчам, што ён вымушан пайсці і адтуль.

На усёй шырокай зямлі для яго няма месца. Ён — Іаў.

І, самае страшнае, ён нідзе не можа цяпер выдаваць кнігі. "Удзячны" народ не падтрымаў яго. Праўдзівей, яшчэ мала і слаба ведаў аб ім і, не хочучы гэтага, ненарокам аддзячыў выгнаннем. Ён, вядома, яшчэ будзе іх чытаць, гэтыя кнігі, але тады, калі нават косткі асветніка спарахнеюць у зямлі.

Ягоныя кнігі не патрэбны нават братам. То каму яна патрэбная, кніга на беларускай мове? Габсбургам?

І тады ён паўтарае словы старадаўняга мудраца:

— Не я страціў Афіны. Гэта хутчэй Афіны страцілі мяне.

Каля 1534 або 1535 года Скарына зноў у Празе. Там, дзе так лёгка дыхалася, калі ён быў малады. Ён не ведаў, едучы туды, што там зусім не так лёгка, як у 1517.

Ён назаўсёды пазбаўлены магчымасці і права выдаваць кнігі. Але застаецца яшчэ адно, тое, чым ён займаўся адначасна ўсё жыццё і што цяпер зробіцца ягонай галоўнай справай.

Акрамя ўсяго, ён яшчэ славуты лекар. І калі ён не да канца здолеў даць людзям здаровы розум і здаровую душу — што ж, ён пастараецца, у меру магчымасцей, даць ім хаця б адносна здаровае цела. Можа, з ім не яны, дык іхнія нашчадкі дажывуць да перамогі царства розуму.

Ён лечыць пражскі люд. Ён робіцца вучоным садаводам-батанікам пры двары Фердынанда І. Батанічны сад быў закладзены ў Празе ў 1534 годзе, і Францыск Скарына, несумненна, быў адным з яго заснавальнікаў. Батанічныя сады ў той час былі і "аптэкарскімі гародамі", дзе, пераважна, расло лекавае зелле і лекавыя дрэвы для аптэк. Магчыма, свая аптэка была і ў Скарыны.

І вось усе апошнія гады жыцця вялікі асветнік праводзіць між кветак і дрэў, у садзе, створаным і яго рукамі (сад размяшчаўся недзе там, дзе цяпер Галоўпаштамт, непадалёк ад Вацлаўскай плошчы).

Усё жыццё ён бараніў людзей ад духоўнай і фізічнай смерці.

Смерць і неўміручасць — прыйшла да яго каля 1551 года.

Ніхто не ведае, дзе ён пахаваны. Можна думаць, што недзе на старых могілках на Градчанах. Але ад іх даўно не засталося і следу, бо яны былі знесены падчас Габсбургскай рэакцыі пасля

Белай Гары.

Так што магілай яго трэба лічыць проста Прагу. Усю Прагу. Яго не падтрымліваў пры жыцці ніхто, за выключэннем нешматлікіх сяброў. Але ў яго быў і яшчэ адзін сябар, які кніг тых тады амаль не чытаў, і для якога, аднак, і распачаў Францыск Скарына сваю катаржную працу.

Народ.

І праца тая не была дарэмнай. Хутка пасля смерці вялікага першадрукара друкарні на Беларусі пачалі расці, як грыбы. Пераможнага шэсця кнігі ўжо нельга было спыніць. Розум Чалавечы ўставаў ва ўвесь рост, хаця доўга яшчэ, цяжка, пакутна было яму ісці — першы крок быў зроблены.

Хто ведае, як цяжка давялося б кнізе і асвеце беларускай без яго? Але ён быў і неадрыўнай часткай культурнага жыцця Прагі.

Я іду з другам дварамі Каралінума. Вось Славянская бібліятэка. Тры з паловай мільёны тамоў. Практычна ўсё, што можна ведаць аб нашым з вамі свеце. І сярод іх — пятнаццаць тысяч беларускіх назваў, не лічачы часопісаў і газет. Нават не трэба асабліва ездзіць у багацейшыя бібліятэкі свету, каб зведаць аб маім народзе ўсё.

Прыехаць трэба — і не раз — толькі каб ведаць яго знутры. І сярод гэтых назваў першая наша друкаваная кніга. Кніга Скарыны. Маці тых мільёнаў, што выдаюцца ў нас зараз.

І за гэта дзякуй Скарыне і Празе.

…Я іду вуліцамі горада. І мне ўсё здаецца, што начнымі пражскімі вуліцамі ўсё яшчэ гучаць ягоныя крокі, што шматпакутныя і святыя пліты пражскіх тратуараў берагуць у сабе не толькі цеплыню мільёнаў ног, якія стагоддзямі хадзілі і ходзяць па іх, але і яго цеплыню, што ў старых камяніцах Прагі засталася частка і ягонай душы, душы вучонага, асветніка, гуманіста, паэта, барацьбіта з несправядлівасцю, варварствам і цемрай. Чалавека, які першы звязаў беларусаў і чэхаў у іхняй агульнай любові да ведаў і святла.

Тут ён жыў. Чалавек, які верыў у сілу дабрыні і ўсё жыццё змагаўся за перамогу гэтай сілы. Тут ён памёр. Тут пахаваны.

Прага стала яго магілай.

Пражскага праху, пражскай зямлі стала крыху болей. Пражскага духу, духу гуманізму, асветы, доблесці стала намнога болей. А, значыць, у жылах гэтага вялікага горада цячэ кропля і беларускай крыві.

І мы, беларусы, ганарымся гэтым.

Прага, 5 ліпеня,1973 г.

Зліццё з душой народнай

У ноч летняга сонцастаяння, калі самая магутная жыватворная сіла зямлі, калі паляць вогнішчы і гарыць над карагодамі прасмаленае кола — "сонца", а дзяўчаты пускаюць па рачной плыні вянкі, на кароткае імгненне расцвітае ў лясной глухамані папараць. Пад абаронаю сіл зла. Хто адолее іх, хто сарве гэтую агонь-кветку, той здабудзе шчасце людзям і сабе.

Гэта ноч на Івана Купалу.

Такой яна была і ў 1882 годзе. Цёмныя і магутныя былі сілы зла, мёртвым было маўчанне палёў. Але агонь-кветка разгаралася недзе ў бураломе. І думкі паэта былі толькі пра тое, каб здабыць яе, што б там ні каштавала, для прыгнечанага, але гордага і таленавітага беларускага народа.

І само жыццё будучага паэта спачатку нічым не адрознівалася ад тысяч і тысяч такіх, як ён. Плуг і каса, вілы і цэп. Два класы народнага вучылішча, і зноў гэта скупая зямля. Падзол, россып камянёў, верас. Яна, праўда, была здзіўляючая, сціпла чароўная са сваімі пагоркамі, непраходнымі пушчамі, светлымі водамі, зімою патанала ў снягах, а летам у кветках. Але гэта прыгажосць, гэта харство не давалі ўдосталь хлеба, бо належалі чужым. Твае на ёй толькі мускулы, рукі.

І на гэтай зямлі людзі і ён, будучы паэт гэтых людзей. Яму няма чаго сыходзіць да народа. Ён сам — народ. Па душы і крыві.

Земляроб-араты, хатні настаўнік, прыказчык, пісар, памочнік вінакура (а значыць, дзе патрэбна, і рабочы), бібліятэкар, журналіст, рэдактар адной з першых беларускіх газет "Наша ніва". А потым адзін з заснавальнікаў беларускага універсітэта, акадэміі, беларускіх выдавецтваў, нацыянальнага тэатра.

Але перш за ўсё Паэт. Шмат іх яшчэ будзе на Беларусі. А ён застанецца для нас першай любоўю, арганам, які мы стварылі, каб найбольш поўна выказаць саміх сябе, уладаром нашых дум, якога мы выбралі не пад уплывам абставін, а як адна душа і добраахвотна, па сваёй волі.

Гэта пачалося на заранку нашага стагоддзя, з першых яго надрукаваных радкоў. Прыціснуты цяжкай працай, абсмяяны моцнымі, асуджаны пакінуць гэты свет, як сабака, беларускі мужык раптам уладарна кінуў у кучу ўсеагульнага бунту супраць несправядлівасці сваю лямцавую шапку:

Але хоць колькі жыць тут буду,
Як будзе век тут мой вялік,

Ніколі, браткі, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык.
І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык:
Што хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць! — бо я мужык.

Потым пайшлі першыя зборнікі вершаў "Жалейка", "Гусляр", "Шляхам жыцця". Але ж і бацькі нашы, бадай, ведалі Купалу часцей не па друкаваных радках (ім часам цяжка было прабрацца ў сельскую хату, на хутар, у дом гараджаніна ці фальварак). Ён уваходзіў у іх жыццё як калыханка, як шолах лістоты пад начным ветрам, звон трыснягу на лясных азёрах, сум балот і палёў і трывожнае зарыва далёкага пажару, як спеў ліры ў руках сляпога і як вочы тых людзей, што чыталі вершы Купалы на вечарынках і ставілі яго п'есы. Ён уваходзіў музыкай нават пад тыя курныя стрэхі, дзе ніколі не чулі яго імя. А гэта хіба не найвышэйшая ўзнагарода для песняра?

"Я не паэта", — сказаў ён у адным з вершаў. І сапраўды, калі ўяўляць паэта з сонечным німбам на галаве і лірай Апалона ў руках, — ён не паэт. На галаве яго — сялянская шапка, у руках — жалейка пастуха.

Але для нас ён больш чым паэт. Ён іграў на струнах нашай душы, як хацеў.

Вось ён шэпча:

Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор,
Ці запеў салавей, ці загагала гусь, —
Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю — Беларусь.

І парог хаты, заліты месячным святлом, адказвае яму.

А вось ён узвышае голас:

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць навучыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.

І чуцён тупат мільёнаў ног, і бачны косы, узнесеныя ў зарыва.

…І вось яшчэ ледзь не самае галоўнае. З бегам часу Янка Купала ўсё больш нагадвае нам нашы маленства і юнацтва. Яны не былі ў нас бязвоблачнымі. Нашэсце, недаяданне, холад, цяжкая

праца. Але цяпер… цяпер яны здаюцца нам шчаслівымі і поўнымі пазнання хараства. Бо гэта і сапраўды было пазнанне хараства свету, няхай сабе жорсткага і суровага. І ніхто ўжо не верне нам гэтых дзіцячых, шырока адкрытых на свет вачэй, гэтых усё ж шчаслівых, таму што беззваротных, дзён.

Хіба што Купала і лепшыя, хто стаяў з ім плячо ў плячо.

Ён — наш гнеў. Ён — наша асуджэнне прыгнёту і рабства, несправядлівасці і вайны. Але ён жа і наша ўсхваленне радасці. Я не ведаю ў славянскай (і, магчыма, не толькі ў славянскай) паэзіі такога па-язычаску дзёрзкага гімна шчасцю, каханню, сонцу, вольнай працы на вольнай зямлі побач з любімым, блізкім табе чалавекам, як паэма "Яна і я".

Сэрца чалавечае разарвалася б, калі б у ім заўсёды жыла адна лютасць. І грош цана сэрцу, якое ведае адну жорсткасць і не можа хоць падчас заліцца ў бяспамятнай ад захаплення песні.

Зайздросны лёс!

Але ў тым і ўся сутнасць, што лёс ніколі не дае геніям поўнага шчасця, быццам нават зайздросцячы ім. Не быў ён ласкавы і да нашага паэта. Не кажучы ўжо аб неўладкаваным юнацтве, аб тым, што першы зборнік толькі цудам не прывёў яго на тры гады ў выпраўленчы дом, на восем гадоў у катаргу, не кажучы аб паклёпах ворагаў і здрадніцтве фальшывых сяброў — ён яшчэ азмрочыў апошні год яго жыцця ценем самай страшнай вайны, якую давялося перажыць за ўсю сваю гісторыю яго Радзіме.

Яму давялося пакінуць родную зямлю, захопленую і бязлітасна скатаваную ворагам. Ён, праўда, не ведаў, што кожны чацвёрты яго адзінапляменнік загіне са зброяй у руках ці загнаны ў падпаленае гумно (гэта падлічылі пазней). Але ён яшчэ і не бачыў пералому вайны. Да перамогі на Волзе заставалася некалькі месяцаў, калі ён памёр. Ён верыў у тое, што ніякая сіла не зможа знішчыць ці паставіць на калені яго народ. Аднак гэта была вера, азмрочаная пакутай за яго.

Пакласці ўсё сэрца на тое, каб ён, родны народ, быў шчаслівы і вольны, і бачыць яго змаганне, пакуты, гібель — якое сэрца можа гэта вытрымаць?

І ў той дзень, калі перастала біцца сэрца паэта, — на захопленай ворагам радзіме аддавалі зямлі цела яго маці.

Больш за ўсё мне хацелася б супакоіць яго, што ўсё абышлося: нам неслі смерць, але мы не памерлі.

І ў глыбіні душы я веру, што ён ведае гэта. Не можа не ведаць, раз лёс даў яму ўсё ж найвышэйшае шчасце поўнай адпаведнасці і зліцця яго душы з душой народнай.

Гэты чалавек усім створаным вярнуў народу годнасць, годнасць за сваё мінулае, сілу жыць у сённяшнім, мужнасць, каб

глядзець у будучыню.

Бываюць паэты большага ці меншага генія, больш ці менш моцнага ўплыву на розум і ўяўленне Чалавека, але для нас, беларусаў, ён адзін такі.

Ён — Купала. І гэтым усё сказана.

Князь і гусляр

З першага слова павінен папярэдзіць — гэты чалавек не абыякавы мне. З даўняга часу нас з ім звязвае трывалае сяброўства. Мы не часта заходзім адзін да аднаго, — хутчэй нават рэдка, — але досыць таго, што мы часта думаем адзін пра аднаго (я спадзяюся, што ён гэтую думку падтрымае).

Арлен Кашкурэвіч — яму імя. Сваёй працай ён заслужыў тое, каб імя гэтае ведалі.

Даўно, яшчэ з самага пачатку, калі ён зрабіў ілюстрацыі да Халдара Лакснеса — я зразумеў, што перад намі мастак суровы, паўночны. І, адначасова, беларускі, мяккі, - калі можна гаварыць пра мяккасць нашага народу, — добры, наш.

Сёння мне трэба рэкамендаваць, — калі трэба рэкамендаваць работы, якія сведчаць самі за сябе, — дзве яго рэчы: ілюстрацыі да славутай паэмы вялікага нашага песняра — "Курган".

Перш, чым узяцца за гэта, я хацеў бы пагаварыць пра лепшыя, на мой погляд, ягоныя графічныя работы. Я люблю ягоную "Більярдную".

І яшчэ адна работа, якую я ўбачыў нядаўна ў майстэрні: "Нотр-Дам. Дождж." Размытае, цёмнае, начное, нібы ўвесь змрок Сярэднявечча, ўсе Війёны і Гюго абурыліся яму на плечы, разам са зліваю і снегам. Храм — адно з лепшых стварэнняў чалавека.

Сорамна пісаць, што гэты чалавек некалькі разоў ілюстраваў мае кнігі? Аніколькі! Таму што гэта той рэдкі выпадак, калі аўтар не жадае іншага дырыжора для сваёй музыкі. І шкадую я толькі аб тым, што нам мала давялося папрацаваць разам і нам няшмат выпадала працаваць разам.

Ясна, што і Алесь мой іншы і Выліваха крыху іншы (уяўленне кожнага чалавека дужа не падобнае і своеасаблівае), але яны максімальна прыбліжаныя да майго аблічча. І я адчуваю, што і сам аўтар увесь час жыве гэтым, думае, набліжаецца. І кожны быў бы ўсцешаны гэтым.

А цяпер — "Курган". Наіўны друк часоў маладога Янкі Купалы не мог нават і думаць аб тонкасці, яснасці, дакладнасці сучаснага друку. Вялікі паэт за сваім жыццём так і не дачакаўся ілюстратараў. Але, думаю, работы А.Кашкурэвіча задаволілі б яго. У іх ёсць рамантызм і ёсць праўда. прысутныя ў творчасці Я.Купалы.

Я не магу забыць вобраза, прысвечанага катоўням князя:

Брацця мучацца там, табой кінуты ў гразь.

Чэрві зажыва точаць іх цела…

Дантава пекла! Мноства звітых у адно людзей. І над імі кажаны — сярэдневяковы сімвал пакуты. Той, якая, на жаль, сустракалася ў Майданэках і якой не павінна быць.

Вось і гэтыя дзве ілюстрацыі. Хіба не бачыце вы тут закладзенага ў самім творы супрацьстаўлення! Гэтыя гранёныя латы, гэтая парча, гэты бязлітасна востры позірк. І гэтая вонкавая мяккасць чалавека, трапяткія рукі якога ляжаць на гуслях. Позірк сляпога. Не таму, што сляпы, а таму, што занадта відушчы.

І гэтая мяккасць мацней за гэтую ўдаваную сілу. І так яно будзе давеку.

Летапісец

Да 75-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча

Летапісцы часам адкладалі пяро і бралі ў рукі зброю, але галоўнай іхняй сілай было ўсё ж пяро — самая смертаносная зброя на зямлі. Таму што чыстае пяро, рана ці позна, абавязкова заб'е.

Гэты чалавек быў Нестарам у новым разуменні намі нашай гісторыі. Ён пачаў тую справу, якую мы ўсе робім цяпер болей ці меней, з большым ці меншым поспехам.

Ён быў геніяльны паэт. Яго звалі Максім Багдановіч. Усё жыццё ён думаў пра Беларусь, пра людзей, хварэў за іх, піянерам ішоў праз нетры, прасякаючы шлях, церабіў зарасці, бурыў гнілыя дрэвы хлуслівых аўтарытэтаў, каб яны не падалі на галаву Чалавеку. І паўсюль паставіў, дзеля нас, абярэжныя слупы:

— Ціха, тут водзяцца злыя цёмныя сілы. Загубяць, калі не будзеце берагчыся!

— На гэтым шляху — загінеш!

— Асцярожна — дрыгва!

- Ідзі, тут светлая, надзейная дарога!

Ён працаваў катаржна. Можа, таму і падарваўся. І памёр. Яму было б зараз семдзесят пяць год. Мог бы суцяшаць нас сваім існаваннем на зямлі. І вось няма. І, нават, здаецца ён нам чымсьці далёкім-далёкім (хаця і давеку блізкі), чымсьці такім, што даўно адышло ў нябыт (хаця і грэе нас нязгаснымі праменнямі сапраўднага генія).

Якая прычына, што Максім Багдаеовіч астанецца для нас ледзь не самай сімпатычнай і роднай постаццю ў гісторыі беларускай літаратуры?

Па-першае, ён змагаўся наводдаль ад сваёй арміі. Іншым было лягчэй. Яны былі сузор'ем. Ён — самотнай зоркай, якая, вядома, бачыла святло ад вялікай галактыкі свайго народа і ад сузор'я лепшых сыноў яго, паплечнікаў сваіх — але ўсё ж палала наводдаль. Іншыя нарадзіліся ва ўлонні свайго народа, чулі ўвесь час яго мову, усмакталі яе з малаком маці і з вадою беларускіх крыніц. Гэты — чуў яе ад лічаных людзей. Ён большую частку свайго жыцця не бачыў радзімы, а калі ўбачыў, то спустошаную вайной, няшчасную, знявечаную і збрыджаную. Убачыў, каб адразу ж самотна памерці наводдаль ад яе.

Іншыя, можа, больш зрабілі. Але трагізм і веліч гэтага

кароткага жыцця, пагрозная і шчымлівая яго нота — глыбей закранаюць наша сэрца. Мы супакутуем яму, і таму ён не толькі наш настаўнік, але і нібыта святло сэрца нашага, улюбёны сын, з нараджэннем якога мы пачалі новае жыццё, які зрабіў нас мудрэйшымі і дабрэйшымі, адкрыў нам вочы на нас саміх, прымусіў па заслугах ганарыцца сабой.

І адышоў, не пакінуўшы нам суцяшэння.

Па-другое, гэты чалавек ніколі не зведаў кампрамісаў, ніколі не дапусціў сваё сумленне да згоды, не пісаў таго, чаго не думаў, цвёрда ішоў па адзіна магчымым для чалавека шляху, шляху годнасці і сцвярджэння права на сваю, адметную, незалежную думку. Без гэтага называцца чалавекам не мае права ніхто. І вось ён, незайманы, кінуў нас, астаўшыся ў сэрцах нашых найвышэйшым прыкладам такога вось Чалавека.

Па-трэцяе, ён бараніў годнасць чалавечую, клікаў да гуманізму і на гэтай дарозе адступленняў не ведаў.

Па-чацвёртае, быў наскрозь гістарычным паэтам, у тым сэнсе, што абуджаў у народзе гістарычнае мысленне, а значыць, і гонар. Вось аб гэтым, апошнім, і хацелася б сказаць. Атрымалася так, што за многія і многія дзесяцігоддзі бяспраўя з людзей выбілі памяць. Здавалася, маўчалі вякі, здавалася, у нас не было мінулага, а значыць, не было і акрэсленай будучыні.

І вось з'яўляецца юнак і, падобна летапісцу з уласнага верша, раптам дае гэтай спячай памяці першы штуршок:

— Падымі галаву! За табою — веліч! За табою — барацьба! Ты не бязбацькавіч! У цябе ёсць продкі, якімі можна і трэба ганарыцца!

Загінулі яны, і, можа, сотні год
З часоў тых працяклі, і згінуў іх народ,
І ўсё змянілася, і ўжо пра іх забылі.
Вы, літары, цяпер нанова ўсё збудзілі!
І людзі зведаюць аб прадзедах сваіх, —
Аб горы, радасцях і аб прыгодах іх,
Каму маліліся, чаго яны шукалі,
Дзе на глыбокім дне іх крыюць мора хвалі.

Я не ведаю дагэтуль у беларускай гістарычнай літаратуры лепшага твора, чым "Апавяданне аб іконніку і залатару, людзях мудрых і красамоўных, кнігалюбцам нейкім дзеля славы божай ды размнажэння дабра паспалітага выдадзенае".

І гэта нягледзячы на тое, што "гістарычнага" ў ім — акрамя антуражу ды мовы — уласна няма, а ёсць разважанні аб мастацтве.

Але хіба мова — гэта так мала? Хіба не палова справы — даць гісторыі язык? Язык, якога не пазбавілі.

Золата, срэбра і чэрнь. Вось кажа Раман Якубовіч:

"Бо, здаецца, кожны зразумець можа, што святая ікона пана бога, хаця б і зусім няўдала зробленая, бязмерна больш варта, чым са пса якога-небудзь малюнак найлепшы".

Адказвае залатых спраў майстра, Антон Корж:

"Вось чаму я, хрысціянін не горшы ад іншых, рэчы свае выраблюючы, адно толькі красу формы пільную ды не думаю аб тым, нашто нанізкі залатыя мае пойдуць: ці то на здабленне фігуры маткі боскай, або піяка і распуснік які на пакраску сваю ўжываць іх будзе".

Мова! Два чалавекі, два характары, два стылі. І яшчэ трэці стыль, стыль гісторыі, сапраўдны — аж валасы варушацца — вецер яе. І дорага б я даў, каб напісаць некалі нешта падобнае.

…А што, вас ніколі не здзіўляла, адкуль яно ўзялося, адкуль гэты бог з машыны, адкуль гэты, уласна, хлопчык мог так ведаць усё?

Не было і не магло ж у яго быць доступу да гістарычных дакументаў (не ў Яраслаўлі ж шукаць беларускія архівы), не было яшчэ грунтоўных прац па старажытнай мове. Не было ў яго і падрыхтоўкі да чытання старажытных папер, не быў спецыялістам у палеаграфіі.

Былі, што праўда, тамы актаў, выдадзеныя рознымі археалагічнымі камісіямі. Але ж падбор дакументаў?! І ўвогуле: аб'ектыўнасць досыць рэдкая госця ў падобных выданнях.

…Былі кнігі. Таксама збольшага, наскрозь тэндэнцыйныя ў той ці іншы бок. Сапраўдных мала. Смярдзяць ялеем і халопствам.

Не ў Бацюшкава ж, не ў Ратча, не ў Мураўёва, не ў іншых, імя якім — легіён, было яму вучыцца веданню таго, што такое народ. Кожны з гэтых людзей рабіў з гісторыю наймічку або наложніцу і рабіў з ёю што хацеў, ведаў, што бараніцца не будзе, ведаў, што для іншых людзей, для жаніха, якому яна патрэбна, як паветра, і імя якому — Народ, яна замкнёна за сямю пячацямі, за кратамі архіваў, за цёмнай мовай мінулага, за неадрыўнай вяззю папер.

І вось, перачытаўшы сотні даследаванняў, перакапаўшы стосы папер, пабачыўшы ў сто разоў болей, чым гэты вечны юнак, раптам разумееш, што ты ягоны вучань, што ён прадчуваў болей, чым ты ведаеш. Мала таго, магчыма, ты бачыш гэта ўсё, бачыш многа, бо ён даў табе вочы. Нарадзіў погляд на ўсе гэтыя дакументы, на ўсе з'явы, даў у рукі арыядніну ніць, каб не заблукаў у цёмных лабірынтах беларускага мінулага.

Толькі геніяльнай інтуіцыяй можна растлумачыць гэта. Наскрозь дэмакратычным светапоглядам, веданнем, што ніколі,

нізавошта нельга даваць у крыўду просты народ, і ўсё, што не на яго карысць — ад лукавага, у якія б прыгожыя тогі яно ні драпіравалася, якія б высокія словы ні казала.

І лепшы доказ гэтаму — "Слуцкія ткачыхі" ў рэдакцыі "Вянка", можа, найвялікшы наш шэдэўр.

Якія б ні былі зіхоткія і залатыя тканіны — яны не каштуюць слязы дзяўчыны, што нарадзіла гэтую прыгажосць. А калі яна, гэтая тканіна, усё ж мае права на існаванне, то гэта таму, што яна — памяць аб бязведамных ткачыхах, доказ іхняй геніяльнасці.

Багдановіч зведаў усё гэта. І з гэтага ведання нарадзіў сапраўдную паэзію, высокае золата і жалеза якой пражываюць вякі.

Што дало яму вернасць погляду? Мне здаецца, фальклор. Адзіны з усіх — народ не будзе не толькі сведчыць супраць сябе (на гэта многія не майстры), а і хлусіць. Гэта за яго робяць іншыя.

А Паэт ведаў паэзію свайго народа, як ніхто. Нездарма быў сынам этнографа. І, як кожны сапраўдны сын і вучань, перарос бацьку і настаўніка. У чым? У прыватнасці, у тым, што не паверыў сцвярджэнню аб аднастайнасці беларускай песні. І меў рацыю. Але мала таго — узбагаціў тую песню.

У чым яшчэ? Не мог паверыць, напрыклад, што на Беларусі не збераглося гістарычных паданняў, што ў народа беларускага няма гістарычнага мыслення.

"Няма доказаў, няма фактаў, што паданні зберагліся, — тым горш для фактаў. Няма — значыцца, пакуль не знайшлі. Не існуе народаў без памяці, без легенд. І нельга чакаць, сядзець склаўшы рукі. Трэба, пакуль знойдуцца такія, — даць люду свае".

Велічная, надзвычайная вера. І, як раней чэх Ганка, ён піша гэтыя паданні, толькі што не выдае іх за народныя, не падрабляе, як той падрабіў "старажытны" Краледворскі рукапіс (Багдановіч дзеля гэтага занадта паэт).

Сёння мы ведаем, што паэт не памыліўся, што эпас, што паданні ёсць, што і цяпер мы ствараем іх. Раскіданыя ў старажытных кнігах, у летапісах ("паданне аб мужыцкім Хрысце"), запісаныя фальклярыстамі, але запісаныя ці выдадзеныя пазней, яны, каб іх, апрацаваўшы, скласці з асколкаў у цэлае, маглі быць эпапеяй, вартай іншых вялікіх эпапей розных народаў. Беларусь чакае яшчэ свайго Лёнрата, свайго Лаггфела, якія зноў складуць у цэлае разбітае некалі бязлітасным часам.

І дачакаецца.

Сёння, на грунце ўжо вядомага, мы здзіўляемся, як Багдановіч трапна адчуў асаблівасці народнай мовы і самы склад народнага мыслення ў гістарычным эпасе.

"Максіма і Магдалену" маглі б спяваць лірнікі, каб яны былі ў

наш час, каб дажылі.

Хоча зноў пачуць тое гранніца
У астатні раз,
У смяротны час.
На апошняе са светам развітанніца.
.
Магда, Магдачка,
Мая зоранька ясная,
Маё сонейка прэкраснае!
Ой, да сонейка
Па зямлі цвяты расцвітаюць,
Ад яго ж яны й пасыхаюць.
А ты, сонца, свеціш,
Залатое, святое,
І не ведаеш тое.

"Страціма-лебедзя" — рэч у вышэйшай ступені інтэлігентную — маглі б, аднак, спяваць магілёўскія "дзяды" разам з плачам, "плачам-узрыдаем". І таксама плакалі б, жахаліся і шкадавалі, і ў глыбіні душы наракалі на бога астравецкія, полацкія ці лельчыцкія бабы.

Не анёл у трубу уструбіў —
З хмары бог старому Ною гаварыў:
Поўна з краем чаша гневу майго
На людскія грахі ды бясчыннасці.

І ў "Калевалу" беларускую стараннем будучага нашага Лёнрата (каб такі прыём быў дазволены) гістарычныя вершы Максіма Багдановіча маглі б увайсці ў якасці лепшых яе частак, побач са славутай "Дачкой Андрэя", з "Яварам і бярозай", з апрацаванымі адпаведна гісторыямі "Кронік", з легендамі, з "Ой, вайна была" і "Ой, закурэла, ой, задымела сырымі дрывамі", з тысячамі іншых эпічных твораў.

Характар гістарызму ў нашага паэта своеасаблівы. Амаль няма гістарычных асоб. Гэта Скарына ў вершы "Безнадзейнасць" (і, магчыма, не зусім той Скарына, якога мы ведаем). Гэта князь Ізяслаў Полацкі, што загінуў у сечы з літоўцамі.

Вось, бадай, і ўсё. І гэта зразумела. Багдановіч жыў на зары Адраджэння, і ён параўнаўча мала ведаў. Але ён прадбачыў усё, разумеў усё і ў няведанні сваім глядзеў праўдзівей і далей, чым некаторыя прафесары гісторыі, што свядома скажаюць ісціну.

Бачыў далей, таму што ведаў: калі гісторыя народа нераспрацаваная, малавядомая — ёсць адзіны сродак пазбегнуць памылкі, расказваючы аб ёй. Зрабіць героем сваіх вершаў самую вялікую гістарычную асобу — Народ.

Той, што адзін толькі мае права распараджацца сваім лёсам. Той, што не вінен у сваіх памылках. Той, што адзіны стваральнік сваёй велічы і сваёй справядлівасці.

Той, што ўмее кахаць і адказваць за каханне, як адказваў за каханне да Магды Максім.

Той, што не дасць у крыўду высокага гонару роднай зямлі, - гэта ў геніяльнай "Пагоні".

Ён часам прымхлівы, як дзяўчына ў "Ціхім вечары" або дзед з верша "Па ляду ў густым бары". Але ён умее працаваць, перад ім ёсць будучыня.

І яшчэ таму Багдановіч бачыў далей, што ён ніколі не страчваў веры ў неадольнасць чалавечага руху наперад. Адзін з самых кранальных у гэтым сэнсе вершаў "Агата". Не на шырокім палатне, не з барабанным боем, а проста, недакучліва, няголасна гаворыць пра абуджэнне Чалавека ў чалавеку паэт.

Дзяўчына з сярэдневяковага беларускага горада ідзе да ратушы, дзе паляць ведзьмакоў. Ідзе глядзець. Усё натуральна: раз ёсць ведзьмакі — патрэбна і вогнішча.

Ідзе і сустракае прыўкраснага конніка, губляе яго з вачэй. І вось каханне абуджае яе. І яна ўжо здатная страціць уратаванне за нованабытую любоў, за каханне, загубіць варажбою душу і, магчыма, самой згарэць на вогнішчы, як гарэлі ведзьмакі, абы здабыць, абы ўбачыць светлага конніка ў залатым шаломе, свайго "Юр'я Святога", які пакуль скача недзе ўначы, асветлены далёкім водбліскам пажару.

А значыць, як бы ні заняпаў чалавек — ён знойдзе шлях. І нічога з ім не зробіш.

Максім Багдановіч даў нам першы ўрок гісторыі. Даў яго, нарадзіўшы ў нашых людзях гонар за сваё мінулае, і гістарычнае мысленне, і веру ў будучае.

Аднаго гэтага хапіла б на вечны яму помнік.

Такі ранні помнік!

Зразумела, паэт мог бы не дажыць да сямідзесяціпяцігоддзя і без сухотаў. Войны, рассталяныя патрыёты і проста заложнікі, допыты ў падзямеллях гестапа, нахабны гвалт і тэрор ворагаў, бамбёжкі, тры нашэсці — ці мала было такога, што магло б разбіць кволы сасуд чалавечага цела. Ды яшчэ калі яно — цела паэта. Ды яшчэ такога паэта, як Максім Багдановіч.

Паэты не толькі вешаюцца. Паэтаў і вешаюць. Фалангісты рассталялі Лорку. Досыць было, што Багдановіч проста паэт,

чалавекалюбца, дэмакрат, каб яны вышчарыліся на яго і распялі.

Я дрыжу за кожную кулю, якую яны маглі б усадзіць у яго. За кожны асколак бомбы, які мог бы раздзерці яго сэрца.

За гільяціны, за Трасцянец і іншыя канцэнтрацыйныя лагеры, за кожны паклёп, за кожны артыкул, падобны на здзек. Іх не было, але яны маглі б быць, і сэрца маё абліваецца крывёю за неіснуючыя яго мукі, і я вінавачу фашызм і іншае такое яшчэ і за яго, які нежывы, але мог бы жыць.

І ўсё ж як шкада, што яго няма. Жыццё — вялікая даброта.

Мой друг і мая зямля

Чалавек перажывае дзесяткі расчараванняў. Самыя балючыя з іх — расчараванні ў сябрах. Любіў да няздатнасці заўважаць кепскае — і вось забыўся нават нумар тэлефона.

Але не аб тых размова. Хочацца расказаць пра тых, прыхільнасць да каго як была, так і застаецца моцнай.

Мы шкадуем дзеля іх добрых слоў, саромеемся іх. Чаму? А так, мужчынская дурасць! Хто ведае, праз колькі год позна будзе самому сказаць добрае другу ці ад яго пачуць пра сябе? А яно, добрае слова, часам патрэбней за хлеб і ваду. Бо кепскае мы чуем занадта часта.

Гэта — эскіз. Пра многае не скажаш. Сёе-тое хай пачакае.

Таму вазьміце гэты беглы, штрыхавы партрэт майго сябра і пастарайцеся ўбачыць за ім жывыя чалавечыя рысы.

…Пачалося са смешнага. Недзе ў 1946-м, ці што, годзе пісаў я трагедыю з крыжацкіх часоў (раман з жыцця мамантаў). Гэткі дамарослы валенрадзізм, замешаны на крыві, слінях і ружовай вадзе. Патрэбна было прозвішча аднаму з герояў, а яны мне дужа цяжка даюцца, прозвішчы.

Па радыё, ці яшчэ як, пачуў я прозвішча, якое здалося мне прыдатным.

Так з'явіўся ў маёй трагедыі Янка Брыль. Першага зборніка ягонага я ў той час, клянуся, не чытаў. Нешматлікія тады кнігі ўвогуле цяжка даходзілі ў нашу глуш. Гэтымі абставінамі і тлумачыцца тое, што ходзіць па старонках маёй трагедыі нейкі асобны, зусім непадобны Янка Брыль, нават, здаецца, удавец.

Трэба будзе неяк дабрацца да гэтага забытага ў Оршы опуса ды спаліць яго, калі, вядома, яго ўжо не пусцілі "на сьледзі". (А то зганьбіш і сябе, і, галоўнае, сябра. Уявіце сабе трагічнага героя, напісанага кімсьці з мяне або, нават, з маім прозвішчам. Жах!)

А пасля пайшлі апавяданні. І першыя кнігі. І ўражанне святла. І — памятаеце? — срэбнае павуцінне на дзвярах гумна. І стаіць перад гэтым цудам змучаны жыццём чалавек, які раптам адчуў у сабе душу.

Ва універсітэце мне заказалі для аднаго з украінскіх часопісаў артыкул. Аповесць "У Забалоцці днее" была толькі што адзначана прэміяй. Не памятаю, ці быў той артыкул надрукаваны. Памятаю толькі, што хваліў. Не таму, што на сто працэнтаў падабалася, а таму, што з усяго напісанага тады на гэту тэму — "Забалоцце" рэзка вылучалася. Былі жывыя людзі, абставіны, пейзажы.

Ну і яшчэ: ніколі я не забываў пра апавяданні, заўсёды

спадзяваўся, што будуць і яшчэ лепшыя. І не памыліўся ў гэтым.

А пазней я даведаўся, што кніга шмат памагла аўтару, дала магчымасць больш-менш спакойна пісаць і жыць. І таму я ўдзячны гэтай кнізе. Проста па-чалавечы ўжо. За сябра.

Першая сустрэча наша адбылася ў 1955 годзе, на нарадзе маладых. Амаль дванаццаць год мінула. Было тады яму 38. На год болей, чым мне цяпер. І вось, хай сабе гэты труізм гавораць усе, але не веру я, што яму пяцьдзесят. Сваім гадам не верыш ніколі, а другі — гэта ўсё адно што ты сам.

Сутыкнуліся мы ў цэнтральным кніжным магазіне. Я накупляў вялізарны пакунак беларускіх кніг, каб везці іх у сяло, дзе тады настаўнічаў. Мабыць, памеры гэтага пакунка і звярнулі на сябе ягоную ўвагу.

І вось, неяк непрыкметна, разгаварыліся. Памятаю, што пра вёску, настаўніцкую работу, пра тое, што сумуеш без роднай мовы, без беларускіх кніг. Пра тое, што трэба мне перабірацца на Беларусь. Так з'явілася ў мяне першая са шматлікіх надпісаных ім кніг: томік "Забалоцця" ў вокладцы колеру кавы з малаком.

Мы рабіліся ўсё бліжэй адзін аднаму. Нягледзячы на некаторую розніцу ў гадах. Аднойчы, прыехаўшы ўжо з Оршы, я заначаваў у яго, і тут мы перагаварылі адной з тых шчырых, бадай толькі славянскіх, размоў, калі са здзіўленнем і раптоўнай гарачнасцю заўважаеш, што думаеш аднолькава з іншым, што словы аднаго падхапляе другі, не чакаючы нават канца выказанай думкі, бо яна, як свая. І самае важнае — аднадумства ў дужа важлівых для сябе рэчах. Такіх глыбокіх і часам балючых, што аб іх не скажаш і брату.

А пазней, у Маскве, прыйшоў да мяне ягоны ліст, які літаральна выратаваў мяне ў самы, бадай, страшны час майго жыцця. Бывае, надарыцца такі. І тады чамусьці здараецца так, што сябры нібыта чуюць. Лісты іхнія прыходзяць якраз у той самы вечар, у тую самую патрэбную ноч. Мабыць, у гэтым адрозненне сяброў ад несяброў.

Можа здарыцца, што будзе і часовае ахаладжэнне (чаго не бывае між людзей?). Але забыць тое, што было, забыць той ліст і тую падтрымку я не здолею. Не хачу.

Не скажу, што ў нас не было разыходжанняў.

Часам балюча кранае няўдала выказаная думка, несправядлівая ацэнка той ці іншай з'явы.

Але за гэта б'еш і сябе. Прычым значна часцей. А сябра шкадуеш.

Я, напрыклад, ніколі не мог зразумець, як маглі крытыкаваць "На Быстранцы"? Лепшую аповесць тых год… Як можна ўвогуле крытыкаваць добрыя кнігі, а таўшчэзныя раманы (грэшны ў іх сам,

каюся) узносіць на шчыт. Якое трэба дзеля гэтага мець сумленне?!

Але суддзёю ўсяму — час. Адзіны суддзя, якога нам — баяцца, і адзіны, які мае права судзіць. Табе, Яне, ён не пагражае.

Улетку 1963 года мы паехалі па Слонімшчыне, Лідчыне і Навагрудчыне, і гэтая паездка асабліва зблізіла нас.

Спачатку — цягніком да Баранавіч. Стаялі ля акна. Гаварылі і гаварылі. Пра Коласа — бо за шклом Стаўбцы, пра Багрыма — бо наводдаль быў Крошын. Увогуле пра лёс беларускіх паэтаў і пра кожнага з іх.

Пасля хадзілі па Баранавічах, і ён расказваў, які быў горад і акруга да трыццаць дзевятага года. І я, што заўсёды лічыў Баранавічы сумным горадам, раптам зразумеў: ва ўсяго ёсць свая гісторыя, калі табе расказвае пра яе абазнаны чалавек.

На плошчы сустрэліся мы з Валодзем Калеснікам, што чакаў нас там, і паехалі далей ягонай машынай. На Слонім.

Між дзівосных акруглых узгоркаў, між дрэў, што клубяцца на іх.

Былі скразныя гравюры закінутых мастоў і затравелыя дарогі, што вядуць невядома куды. Быў Слонім, роўны канал і крэмавыя старыя будынкі, ля муроў якіх, у закутках, раслі каравыя старажытныя каштаны.

У Слонімскім музеі ўразіла мяне адна рэч. Я тады пасаромеўся пра яе сказаць. А шкада, можа б, пасмяяліся.

Уразіла каменная галава язычаскага бога. Невядомы скульптар, высякаючы яе, відавочна, меў на ўвазе Янку. Аблічча было такое самае — моцнае і масіўнае.

Вачэй, што праўда, не хапала. Разумных чалавечых вачэй. Што зробіш, продкі таксама ўсяго не прадбачылі…

І толькі гэта ўнутранае падабенства дало мне тады шчаслівае адчуванне рэальнасці таго фантастычнага хараства, што буяла вакол. Аднаго з найпрыгажэйшых гарадоў і адной з найпрыгажэйшых вёсак Беларусі — Кракоткі, і замкаў, і старых муроў.

Людзі ўсё стварылі. А людзі былі шмат у чым падобныя, і ў часы Перуна, і цяпер.

Валодзя збіраў па наваколлі матэрыял пра Валянціна Таўлая, а мы з Янкам проста паталялі ненажэрную прагу прыгажосці. Расказваюць пра патаемныя маёўкі ў лесе, а мы бачым сасняк і суніцы, чырвоную зямную кроў, разліў суніц. І нам усё жыццёва патрэбна: пясчаная Рудаўка, дзе нарадзіўся і жыў вялікага і цяжкага лёсу паэт, і вечна ціхая, зялёная Зельва, месца, дзе жыве харошы чалавек і выдатная паэтэса Ларыса Геніюш.

Там было наша першае знаёмства з ёю. У старажытнай хаце з белымі, выступаючымі бэлькамі (на адной — крук ад даўно

сатлелай калыскі). Кнігі, народныя посцілкі, вялікія беленыя пакоі, у якіх ад Янкі зрабілася цеснавата, нягледзячы на тое, што ён зусім не мядзведзь, а чалавек памяркоўна зграбны.

А ў цэнтры ўсяго мажная, прыгожая летняй прыгажосцю жанчына з чорнымі рукамі сялянкі і адухоўленымі вачыма высакалобага інтэлігента. І мы вакол яе. І спрэчка. Лютая. Ніколі не думаў, што тры спакойныя чалавекі могуць так. Пра літаратуру і мастацтва, пра дабро і зло, пра ўсё, аб чым толькі можна спрачацца на зямлі. А я глядзеў збоку і, шчыра сказаць, памоўчваў.

Не было мне справы да таго, што яны там так утрапёна дзеляць. Каб гэта іншыя — і я ўвязаўся б, ды так, што пер'е паляцела б і з мяне, і з іх. А тут я проста любіў іх траіх, і яны былі добрыя людзі, і гэта было самае важнае, а ўсё астатняе — ад лукавага.

Бясспрэчныя былі сцены з беленых брусоў і старадаўняя зеленаватая чарапіца даху, бясспрэчныя былі беларускія ліпы ў прысадзе і мова, кветкі і чэрвеньскі надвячорак, зямля і мужнасць, талент і сонца. Вось і ўсё.

…Блукалі ў палях дарогі і стаялі ў разліве жытніх палёў чорныя піраміды ядлоўцу-елянцу.

— Як манахі ў жыце стаяць… — сказаў Янка.

І гэта было бясспрэчна. Тым больш што повад для спрэчак ледзь не скончыўся назаўсёды, калі пад Мастамі, на беразе Нёмана, Валодзя ледзь не кульнуўся з яра ў ваду, разам з машынай, і загарлаў на дапамогу. Дзякуй богу, мы з Янкам падскочылі і магутнымі плячыма (калі скласці іх, а пасля падзяліць на двох) падпёрлі "Масквіча".

Шкада было маладога жыцця, разумнага, таленавітага вучонага, дый машыны таксама. Харошая машына! Калі аднойчы, зноў жа трох, ездзілі ў Белавежскую пушчу, то машына ў зелені выглядала чырвоным велікодным яечкам на блюдзе з дзеразой.

Дарэчы, калі зайшла ўжо размова пра пушчу і небяспеку, то варта расказаць і пра тое, як тады, у Белавежы, ледзь не скончыліся нашы "брэнныя жызні". Шукалі мы тады, каб паглядзець зуброў на волі.

— Не знойдзеце.

— А што ж глядзець?

- Ідзіце — унь у загародцы тарпаны…

— Што ж, і на тым дзякуй.

Тарпанаў было два. Конікі. Мышасценькія, з грывамі, як шчоткі. Гладка-мясістыя. З няшчырай рахманасцю ў вачах. Хопіць гэтымі цацачнымі зубкамі за жывот ці наверне капыцікам — неба ў алмазах убачыш.

Загародка — гектары два. З тонкіх гарызантальных бярвенняў. Пасоўваючыся за тарпанамі паўздоўж яе, мінулі мы стогадовую кашлатую яліну-вываруцень (карані з зямлёй трохметровым стаячым бліным закрывалі ад нас усё, што за імі)… і абамлелі.

У лічаных метрах ад нас пасвіўся, таранячы паветра метровай лабацінай, грузла папіраючы зямлю, велічэзны зубр. Горб велічынёю з капец Міцкевіча, барада размятае траву, вочы — чырвоныя вуглі.

І, на радасць нам, побач, трохі меншая за мужа, зубрыха з зубраняткам.

З дзіцем!

Хто як, а я адразу пачаў кеміць, куды б у выпадку чаго…

Зубры, на шчасце, павольна аддаляліся.

Я выйшаў з-за вываратня. Валодзя шчоўкнуў апаратам, "запечатлеў" момант: паэт, маўляў, на фоне…

Зубр пакасіўся на нас, але вырашыў пакінуць двухногіх без увагі. Хутка яны зніклі.

Янка пасля казаў нешта ў гэтым родзе:

— Адзін яшчэ нічога. Можна вакол елкі бегаць. А як яны цябе пачнуць двох вакол яе ганяць. Наверх скакаць — скінуць рагамі. Да тарпанаў, - чорт іх ведае, што яно… Дый агароджу зубру разнесці — глупства.

Я ўявіў, як зубр разносіць лабыром загон, як у гэты момант тарпан хапае кагосьці з нас за мяккія часткі — і нервова зарагатаў.

…А тады, над Нёманам, паабапал дарог, што заблукалі ў палях, цвіла чырвоная канюшына і густыя зарасці чагосьці залатога.

— Жоўтае купалле, што ўплятаюць у вянкі, - адказаў Янка маім думкам.

Час, калі яго ўплятуць у вянкі, быў блізкі. Было 21 чэрвеня.

Размовы тут, сярод палёў, былі такія і не такія, як, скажам, на пасяджэннях у Мінску. Там таксама сядзіш поруч, бо так цікавей: адна думка, дзве рэплікі або проста позірк, які разумее другі (калі, прыпусцім, дакладчык уляпіў у кропку ці чаўпе невылазнае глупства).

Але там гэта размовы крытыкаў, зычлівых і строгіх, размовы людзей з аднаго цэха. А тут гэта былі шырокія, часам бязладныя, але душэўныя бяседы людзей, што ствараюць частку гэтых ніў, душа якіх жыве ў галінах тысячагадовага дуба ў Бабрах, а памяць продкаў — у апошняй, нежылой ужо, курнай хаце ў Маламажэйкаве.

Разумееце, мне, вядома, прыемна, як сустракаюць гэтага

чалавека людзі, асабліва дзеці, як яго пазнаюць на вуліцах. Мне радасна, што мы адзін у аднаго першыя чытачы і крытыкі, што я чытаў "Птушкі і гнёзды" задоўга да надрукавання і яшчэ тады сказаў сам сабе, што гэта дужа своеасаблівы і сучасны раман, магчыма, лепшы за апошнія дзесяцігоддзі.

Усё гэта, вядома, радуе мяне, бо гэта частка вобліку блізкага мне чалавека. Але толькі частка, а не ўвесь чалавек. Больш, чым ёю, я даражу ў гэтым чалавеку тым, што сустракаецца значна радзей. Гэта бездакорная пісьменніцкая і чалавечая сумленнасць. Тое, што вышэй за ўсё цэніцца. А калі цэніцца, то няхай і застаецца назаўсёды на радасць сябрам і ўсім іншым людзям.

І, урэшце, больш за ўсё каштоўнае асабіста для мяне. Тое, што ён хароша чалавек і харошы друг. Чалавек. Асоба.

Каб ён ніколі ў жыцці не напісаў і радка, мы ўсе, вядома, былі б у тысячу разоў бяднейшыя. Але, думаю, што і тады кожны, з кім звёў бы яго лёс, адчуў бы і розум, і сумленне, і высокую даравітасць гэтага чалавека, і зрабіўся б яго другам…

…А тады, у тое падарожжа, зарадзілася яшчэ і тое, без чаго цяпер рэдка абыходзіцца кожная хоць трохі доўгая наша сустрэча. Гэта песні. У яго добры голас, і разам мы ствараем не такі ўжо кепскі дуэт.

Ехалі. Спявалі старажытныя рамансы, беларускія, польскія, украінскія, рускія песні.

Скажу толькі, што любаваўся я тады не толькі Навагрудскім замкам, капцом Міцкевіча і Свіцяззю. Любаваўся яшчэ і ненасытнай чалавечай прагнасцю, з якой глядзеў на ўсё гэта, сто разоў бачанае ім, Янка. Нібы піў прыгажосць.

Прыгажосць поўнай з коптарам Свіцязі, з якой мы, седзячы ў чоўне, цягалі пярэстых, шурпатых акунёў, і прыгажосць паліванага збана з бярозавікам на ганку леснічоўкі, і прыгажосць лепшага ў свеце краявіду з Замкавай гары, калі наводдаль шырацца дрэвы — кожнае пад неба галавой.

І прыгажосць запусцення ў Варончанскім касцёле, і прыгажосць могілак наводдаль ад яго.

І мармуровай дзяўчыны на помніку ў нетрах дрэў.

Прыгожыя дзяўчаты жылі калісь у нашых вёсках і фальварках. І, на жаль, часам рана паміралі. Як гэтая.

Мне здавалася, што ён шкадуе аб ранняй смерці гэтай невядомай нам і, аднак, блізкай Фларыяны Ліпніцкай. Блізкай, бо сэрцу чалавечаму заўсёды блізкая прыгажосць.

А вакол стаялі таполі з аліўкава-зялёнымі, апырсканымі золатам стваламі, кучаравіліся хмызы і сумна канала на захадзе аранжавае сонца.

Гівал дзьмуў у дудку з вадой.

Гівал спяваў.

І тут яшчэ ўзмацнела ва мне адчуванне, што гэты чалавек — паэт, хаця я і не чытаў ніводнага ягонага верша. Паэт, які не можа быць іншым, якому блізкія ўсе гэтыя мясціны, бо невядома, ці ён вырас з іх, ці яны выраслі з яго душы. Блізкая сваён бязмежнай тужлівай журбой ліпавая альтанка Марылі ў Туганавічах, месца, дзе было растаптана сэрца вялікага паэта (а можа, тваё ўласнае?). Блізкі гэты дуб з вялікім дуплом, у якім можна залезці і высунуць стуль галаву, бо ты ў гэты момант хлопчык, лясны дух, лясун, усё на свеце.

Дарэчы, пра дуб. Мы параіліся, і Янка напісаў ліст у камітэт па ахове прыроды:

"Дрэву шэсцьсот год. Звязана з імем Міцкевіча. Трэба ратаваць".

Адказ прыйшоў недзе праз месяц:

"Ва ўрочышчы ля Варончы сапраўды ёсць дуб, і ў ім сапраўды ёсць дзірка".

На чым і дзякуй.

Чамусьці больш за ўсё запомніў я падарожжы з ім. Розныя. Але заўсёды такія, дзе мы ўсё з большай глыбінёй пачыналі ведаць адзін аднаго.

Спасцігаеш друга лепш за ўсё ў месцы, дзе ён нарадзіўся, або там, дзе нарадзіўся ягоны талент.

Пра Янкава Загор'е я раскажу ў канцы, а зараз пастараюся расказаць, як мы ехалі трох па маім Прыдняпроўі і па Ушаччыне, дзе нарадзіўся Рыгор Барадулін.

Зноў стаяла цеплыня. Быў май 1965 года. На берагах Дняпра, на замчышчах, якім дзевяцьсот — тысячу — дзве тысячы чатырыста год, шумела між чарапкоў сівая трава. На котлішчах панскіх маёнткаў цвіла шыпшына, якая выродзілася з руж, і ўсяўладна персідскі бэз. Над Рагачовам, над зялёнымі хмарамі Кісцянёўскага парку, над хутарам Крыцкага (хацеў бы, каб мяне там калісьці закапалі, а да таго хацеў бы, як найчасцей, бываць там) цягнуліся і звінелі веснія, празрыстыя аблокі.

Шапацелі здзічэлыя яблыні. Марылі аб мінулым чорныя дубы на дне і ў берагах. Гэта была прыгажосць, неаддзельная ад лёгкага адцення тугі, бо гэта была мая радзіма, мая купель і курган маіх продкаў, і я дужа хацеў, каб яна стала роднай і хлопцам — уся, ад Прарова да Кісцянёўскіх круч.

Рэўнасць да родных мясцін дужа глыбока жыве ў нас. Але, мне здаецца, я дамогся свайго.

…Леснічоўка Лімень пад Чэрыкавым. Там жывуць у "старыках", у даўніх рэчышчах залатыя, як старое золата царкоўных купалоў, ліні велічынёй з блюда. Там бабровыя хаты,

на якія гаспадары нагрувасцілі ламачча, каб лось не лез на страху ды не праваліў яе.

Янка ўсходзіў на гэтыя купы. І дарэмна, бо важыць ён, нягледзячы на магутны рост, усё ж менш за лася.

Але затое, калі ён зрабіў гэта, ад берага пацягуўся за бліжні мыс серабрысты след: бурбалкі паветра.

Гаспадар ратаваўся. А раптам істота з'явілася крыўдзіць.

Дарма, бабёр! Наздатны ён на гэта.

Янка расказваў мне, як калісьці ў Загор'і злавілі бабра. Усе пабеглі глядзець. Той стаяў у дзежцы з вадой, успёршыся лапамі на край, і плакаў, сапраўды, "як бабёр".

Разумееш, бабёр, у самым гэтым апавяданні была тая неабходная ўвага да ўсяго жывога, якая і ёсць — сутнасць сапраўднага чалавека на зямлі.

Так што не бойся. Пасёрбае ён тут з намі юшкі, пап'е бярозавіку з чорнай парэчкай, смачнага, рэзкага, аж да біцця ў нос, дый паедзе на Крычаў, а далей на маю Оршу, а пасля пагоніцца за намі дождж і адстане толькі ля Полацка, а там, у гасцініцы, мы "знойдзем" у шафе бутэльку каньяку і ўсё іншае, ды будзем раніцай стаяць ля Сафіі, і гэты, вялізны, будзе гладзіць далонню старажытную плінфу муроў. Яму патрэбна Грышкава радзіма. Як і мне. Акварэльна-сіняя ад неба, адбітага ў сотнях азёр, шыза-зялёная ад бароў, жоўтая ад пяску. І патрэбна вогнішча на беразе Ваўчэнскага возера, апетага Рыгорам, і пазрыстая, хуткая, як з гор, рэчка Задобрыца, і ўсе іншыя азёры, цяпер і твае. А назвы іх, як песні: Дземянец, Грамніцкае, Вечалле, Доўжыца.

…Студня на месцы, дзе стаяла Верасоўка, хутар Рыгоравых бацькоў. Там цяпер толькі студня ды старая дзічка.

Котлішчы на месцы нашых радзінных хат.

…Вечарам таго ўшацкага дня была бяседа з летнімі кабетамі, сяброўкамі Рыгоравай маці. Бяседа ў сціплай, скупа асветленай шчодрай хаце, за вокнамі якой шумеў начны вяз. Мудрая бяседа за кубкам брагі пад ушацкія песні, то грубавата-язычаскія, то шчымліва-лірычныя. Голас Янкаў напаўняў хату.

А пасля, як гжэчныя кавалеры, мы пайшлі праводзіць гэтых пажылых партызанак. І ўжо як пайшлі яны вакол нас з язычаскімі "богабрыдкімі" прыпеўкамі — завіравала зямля.

Было гэта пачуццё радзімы, роднай зямлі, народа. Таго, які тут непадалёк, у Жарах, не скарыўся Напалеону і ўвогуле нікому.

…У тое, самае першае наша падарожжа я ўвесь час чакаў, калі з'явіцца перад намі Загор'е. Яно было мне патрэбна дзеля канчатковага разумення таго чалавека, што сядзеў поруч.

Яно з'явілася. Перш за ўсё слуп да ля дарогі. Нашчадак таго самага слупа, у якога адзін Янкаў аднавясковец, будучы ў

падпіцці і не ведаючы, дзе ён, пытаў, са слязьмі і чамусьці "папольску":

— Скажыць, чы тутай ест весь Загужэ?

Мы ў слупа не пыталіся, а проста павярнулі ды паехалі раўнінай, злёгку ўзгорыстай, хлебароднай зямлёй, на якой і ляжала сяло.

Летам сярод палёў. Узімку, мабыць, дранцвеючае ў снягах. Але заўсёды сярод шырыні.

Была новая хата ў цяністым, разложыстым садзе, а ля яе — падмурак старой. Той, што ў многіх і многіх кнігах. А ўбаку, на ўзгорку над рэчкай і над неабсяжным зялёным абшарам, ляжалі вясковыя могілкі, на якіх ружавела шыпшына.

Спіць ідылічная драўляная каплічка, сонна марыць дзікая ружа, спяць тыя, што адпрацавалі свой век, стваральнікі і падаўцы хлеба, пяніцелі зямлі, самыя важлівыя, самыя добрыя і патрэбныя людзі на ёй.

А над усім гэтым — неба.

Я зразумеў. Вось тут. Пад гэтым абшарам. На гэтым абшары. Сярод хлебародных, добрых ніў.

…Вось стаіць новая, шырокая хата. Раней была старая, апісаная ім. А яшчэ раней — на памяці прапрадзедаў — стаяла, можа, такая, як у Маламажэйкаве.

І ў вечнай, няўхільнай пераемнасці пакаленняў жылі ў гэтых хатах — тысячу год таму, пяцьсот, дзвесце, сто, цяпер — жылі продкі. Людзі. Яны вечна ўраблялі зямлю, самі не былі без хлеба і давалі жыць іншым. І вечна вакол быў абшар, а продкі, адпрацаваўшы, адрабіўшы сваё, мірна спалі пад курганамі, на якіх, як суцяшэнне, цвіла шыпшына.

З цёмных старадаўніх хат выбіліся на святло, як парастак з зямлі, насупор нягодам, бурам, сухавеям, тысячам навалаў.

Узраслі.

І за гэта дзякуй табе, беларускі народ. За дабрыню, за таленавітасць, за ўсеўладную сілу, з якой агорваў і агораеш самую страшную бяду.

Народ аратаяў, работнікаў, вечных працаўнікоў.

І ты, дружа, у якім, нягледзячы на высакалобасць, столькі ўсё ж сялянскага, абшарнага, аратайскага — частка гэтага люду.

Лепшыя з нас менавіта гэткія. І таму хопіць цябе яшчэ на век з беларускім гакам.

Бо вакол твая і мая зямля, зямля сяброў і людзей, наша зямля.

Калі прыйдзе мой час — я пайду з яе спакойна, бо я любіў і мяне любілі, бо я меў цябе, родны абшар, меў сяброў, - і сярод іх таго сябра, пра якога я сказаў вам некалькі слоў.

Пакуль гэта сэрца б'ецца

Знаю ўсе яго думы, трывогі,
Чую родны купалаўскі спеў…
Не, я ведаў Купалу жывога,
Хоць сустрэцца з ім і не паспеў…

Заўсёды цяжка гаварыць аб тым, што любіш. І асабліва цяжка сказаць словы любві, калі гэтая любоў ужо не мае мяжы…

Я памятаю час, калі мне ўпершыню трапіла ў рукі кніга Купалы. Магчыма, зарана, бо гэта была "дарослая" кніга, а я быў яшчэ зусім малы. На "дарослыя" кнігі была накладзена забарона, і чытаць іх даводзілася ўпотай. Таму я чакаў, калі ўсе ў доме заснуць, і ў адной сарочцы забіраўся ў ціхі куток. "Забароненыя плады" былі там. І яшчэ там было старое пацёртае крэсла, а на падлозе, на мяккай аўсянай саломе, ляжалі яблыкі. Можна было набраць з шафаў або з кніжнай гары ў кутку хоць дзесяць кніг і чытаць, пакуль між яблынь за акном не ўстане перадранішні туман. Я асабліва любіў вершы. Чаравала самая іх музыка, нават тады, калі сэнс не даходзіў. Гэта здавалася дзівам, большага за якое не было на зямлі.

Я забіраўся ў крэсла, нацягваў сарочку на голыя ногі, і час знікаў. Толькі парыпванне маснічын — яны рыпелі самі — адрывала часам ад радкоў, і тады можна было прыўзняць галаву і глядзець, як далёка-далёка ў цёмным садзе трапеча адбітак маёй свечкі. Часам здавалася, што гэта блішчыць ліхтарык у маленькага хохліка, які стаіўся там, між дрэў, і здалёк глядзіць у акно. Трэба было б папрасіць у яго, каб даў мне доўгі век, больш такіх вось начэй у маўклівым доме, больш гэтага ап'янення і яшчэ — ну, што яму варта! — каб я сам мог, хоць дрэнна, хоць не так, як у гэтых кнігах, ствараць такое дзіва.

Відаць, не выпрасіў.

А радкі адзываліся ў душы і жахам, і холадам, і гарачай дрыготай, як тады, калі працягнеш рукі да агню і цеплыня льецца ад далоняў у цела.

І вось мне трапіла ў рукі кніга ў папяровай вокладцы. Я разгарнуў яе і ўбачыў:

На Купалле там птушка садзіцца, пяе,
У Піліпаўку воўк нема вые,

Сонца днём распускае там косы свае.
Ноччу зоры глядзяць залатыя.

Гэта было як ноч, як агеньчык у цёмным садзе і як водар яблыкаў на аўсянай саломе. І так гэта засталося на ўсё жыццё.

Я чытаў тады ўсю ноч і нарэшце дайшоў да таго стану, калі ўжо нічога, ані паловы слова не разумееш, але ўрачыстая, мернагучная хада радкоў прымушае валасы дыбарам стаяць на галаве.

Гэта было проста і добра. Гэта была тая самая пявучая родная мова, на якой гаварыла мая нянька, — так пяшчотна, — і мой бацька, — так грубавата. Я шмат чытаў для свайго ўзросту, гэта былі радкі, накшталт радкоў нямецкага паэта Мюлера:

Светлый мир здесь погребен когда-то,
И встают обломки, как цветы,
Золотыми искрами заката
Отражаясь в зеркале мечты.

І раптам:

Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор,
Ці запеў салавей, ці загагала гусь, —
Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю — Беларусь.

Гэта было дзіва. Восьмы — а для мяне першы — цуд свету. А потым былі "Магіла льва", "Бандароўна", — і змяніўся свет. Назаўжды.

Я не ўяўляю сабе жыцця без яго. Каб не было той ночы і той кнігі — я ніколі не пісаў бы так, як пішу. Ды і ці пісаў бы наогул?

Шмат радкоў напісаў я аб ім. Менш надрукаваў. Бо словы слабыя, бо словы часам нічога не могуць сказаць.

А беларусы ж нікога не маюць…

Мы маем шмат каго: і Багушэвіча з яго ўтрапёнай нянавісцю, і Багдановіча з яго ўтрапёнай пяшчотай. І ўсё адно Купала застанецца першай нашай любоўю, нашымі вачыма, нашым сумленнем, нашым вечна жывым сэрцам.

Мне давялося бачыць яго толькі аднойчы. Мне тады было, напэўна, год сем. На вуліцах Оршы грымела музыкай нейкае свята. Брат паказаў мне яго, і я здзівіўся: мне здавалася, што ён павінен быць нават фізічна дужэйшы, на дзве галавы вышэйшы за

ўсіх іншых людзей. І дзіўна было, што ён жыве ў Ляўках, зусім недалёка, цераз Дняпро.

З таго часу мінула шмат год. Вайна забрала дом. Вайна забрала брата. Вайна, што б там ні казалі, забрала і Купалу. Толькі аднойчы бачыў я яго, але я ведаю, наколькі бяднейшым было б маё жыццё, каб не гэтая іскра ўспаміну з далёкіх дзіцячых год.

Пасля вайны я пабываў у Ляўках. Попел. Галавешкі. Знявечаныя адхоны над Дняпром, якія любіў Купала і якія, дзякуючы гэтаму, прымусілі мяне яшчэ больш, часам амаль нясцерпна любіць маю сціплую прыдняпроўскую зямлю…

Купалы ўжо не было. І на месцы яго дома быў попел.

Я не разумеў тады, што некаторыя легенды — гэта само жыццё, і не ведаў, што ў легендзе пра Фенікса больш праўды, чым нават у жыцці.

Зразумеў потым, калі ўдвох з сябрам адправіўся пешшу ў Вязынку і ўбачыў простую сялянскую хату, якая стала нашай Мекай. Там я зразумеў: ён жывы.

Нам дорага ўсё ў ім: і ўзлёты генія, і простыя чалавечыя памылкі, і шлях, цяжкі і слаўны, як у кожнага вялікага паэта. І нельга ўзяць з нашых дум яго рамантызм, і яго светлую праўду, і яго веру. Бо ён верыў у казку нашай радзімы.

І ён вельмі верыў у свой народ. Толькі гэта і дало яму сілу ствараць тое, што ён стварыў, даць нямому народу, якім усе пагарджалі, песню, слова і мову.

Больш за ўсё хацелася б мне напісаць паэму аб ім. Не ведаю, ці хопіць сціплых слоў, бо гэта — галоўнае, бо аб гэтым нельга сказаць абы-як. Таму што, напэўна, будуць большыя за яго, — інакш не варта было б жыць паэзіі. Але не будзе людзей, якія больш зрабілі б для маёй мовы, для маёй песні, для маёй Радзімы, нарэшце.

Калі б мяне, маленькага чалавека, спыталі: "Як ты хочаш ушанаваць яго памяць? Кажы — і мы выканаем усё, да апошняга, твае пажаданні, як быццам ты Аладзін і чароўная лямпа ў тваіх руках, а табе прыслужваюць усе добрыя джыны зямлі". Калі б мяне так спыталі — я адказаў бы: "Зрабіце гэта не для яго, бо лепшы помнік яму — нашы сэрцы і яго песні, што жывуць у іх.

Зрабіце гэта не для яго, бо яго славу не ўзвялічаць помнікі. Зрабіце гэта для сябе, каб нас не вінавацілі ў няўдзячнасці, у дрэннай памяці, у адсутнасці той вялікай павагі да лепшага свайго паэта, без якой не жывы кожны народ".

Беларуская зямля чакае праху Купалы, беларускі народ чакае вечнага агню, які будзе гарэць над яго магілай. А ля яе ў вечнай ганаровай варце стануць усе — і суровы Машэка ў ваўчынай

скуры, і Бандароўна — наша непакора-зямля, і Паўлінка — маладое харство гэтай зямлі, і гнеўны Сымон Зяблік з сякераю ў руцэ, і сляпы лірнік з павадыром-хлопчыкам, які глядзіць на свет нясцерпна-чыстымі вачыма будучага вялікага таленту, і крылатая Алеся — гордасць і светлая будучыня зямлі Купалы.

Шмат чаго яшчэ будзе. Быць бязмернаму шчасцю і яснаму сонцу. Быць і небу і хмаркам. Быць, магчыма, і навале. Але мы вытрымаем, бо мы няспынныя, як яго сэрца. І мы будзем жыць, пакуль гэта сэрца б'ецца ў нашых грудзях. Пакуль гэта сэрца б'ецца…

Рыгору Раманівічу Шырме — сардэчныя словы любові

Час бардаў мінуў. Даўно. І ўсё ж яны трапляюцца і цяпер. І тым большая іхняя роля.

…Ён быў дужа цяжкі, былы лёс вялікай песні нашага народа: пад забаронай, толькі пад дымнымі стрэхамі сялянскіх хат. І праследаванні яе, што скончыліся ў былой Заходняй Беларусі параўнаўча яшчэ зусім нядаўна.

Магло б здарыцца горшае. Калі нямецкія рыцары захапілі Прусію, калі пачаў знікаць прускі мелас і пруская мова, у Марыенбурзе, пры замку здарыўся турнір спевакоў. На ім выступіў апошні прускі бард-вайдэлот. Калі ён скончыў спяваць — над натоўпам пракаціўся рогат. Ніхто ўжо не разумеў яго, і дзікія былі гукі ягонай музыкі для ўсіх вушэй. У якасці здзеклівага падарунка рыцары падарылі яму за песню сто пустых арэхаў-свістуноў.

Здарыцца магло б горшае. Каб не энтузіясты і фанатыкі народнай песні, вечныя прапаведнікі яе, людзі, што яшчэ ў мінулым стагоддзі запісвалі яе і апрацоўвалі і выконвалі, прымушаючы сэрцы людзей дрыжаць ад хвалявання, ад замілавання, ад любові да гэтага, напаўзабытага, але роднага, як пяшчотныя матчыны рукі пад роднай страхой.

… Да ліку такіх людзей належыць з поўным правам і дзядзька Рыгор, Рыгор Раманавіч Шырма, васьмідзесяцігаддзе якога мы зараз з любоўю і ўдзячнасю адзначаем.

О, гэта пружанская зямля, што ўся звініць песнямі, дзе іх болей, чым жаўранкаў у сінім небе над пружанскай раллёй! Спяваюць сінія роўныя лясы, спяваюць салаўі ў альховых зарасцях, спяваюць у залатым вячэрнім сонцы пчолы, спяваюць лянотныя рэкі і сама зямля. Што здзіўляцца, што й людзі тут спявучыя. Што здзіўляцца, што 80 гадоў таму назад нарадзіўся тут хлопчык, якому суджана было стаць гонарам нашай музычнай культуры, энтузіястам і мужным абаронцам беларускай песні. Вартавым пры яе скарбніцы.

Шлях ягоны смела можна назваць гераічным. Асветнік, кіраўнік ТБШ, педагог у адной з нешматлікіх заходнебеларускіх гімназій, нястомны лектар, выдавец кніг (між іншым, такіх выдатных паэтаў, як В.Таўлай і М.Танк), збіральнік нашых музычных скарбаў, які ўласнымі нагамі схадзіў кожны куток сваёй Айчыны.

Заснавальнік многіх народных хораў. Стваральнік аднаго з лепшых харавых калектываў СССР — Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларускай ССР і, да нядаўняга часу, нязменны яе кіраўнік.

Выдавец шматлікіх, ім жа сабраных збораў песень, дзе кожная — непаўторны, дыямент.

І хоць сказана недзе, што песня, вырваўшыся на волю, гаворыць спеваку:

Ты мяне да паперы не прывяжаш,
У скураную не пасодзіш клетку.
Толькі цень свой — чорныя знакі,
Толькі цень свой — літараў россып,
Бледны водгук гукаў магутных —
Вось і ўсё, што я табе пакіну.

І калі запіс яе зроблены, то спявак пакідае:

Бездыханны цень народнай песні,
Як пялёстак, засушаны ў кнізе…

Гэта, аднак, няпраўда. Песня часам можа знікнуць. Пялёстак застаецца, пакуль жыве кніга.

…Чалавек, якому за багатае яго жыццё часта даводзілася не словам, а справай даводзіць гарачую любоў да роднага меласу і часам плаціцца за яе. Аж да камеры панскіх Лукішак.

Усё жыццё сваё ён паклаў на тое, каб жыла, каб пераможна звінела песня наша. Усё жыццё. Кожнае імгненне ягонае.

…Я памятаю, як першы раз убачыў яго. На нарадзе маладых пісьменнікаў у 1955-м, здаецца, годзе. Выйшаў невысокі, сівы, як абдуванчык, чалавек з абліччам ці то настаўніка, ці то гэткага беларускага Дон Кіхота і загаварыў прыемным глухаватым голасам, з гэткім мяккім пружанскім акцэнтам "гэ-то-го", "за-мно-го". Загаварыў у віслыя вусы і сівую эспаньёлку рэчы, якія адразу зачаравалі нас. І адразу выяснілася, якая велічная рэч наша песня, колькіх кампазітараў, ад Манюшкі да Рымскага-Корсакава, яна натхняла. І загучала арыя з "Галькі", заснаваная на мелодыі нашай песні, і "Песня Леля", якой, на самай справе, з'яўляецца наша "Ой, ляцеў арлішча".

І цяпер з усведамлення яе велічы нас не саб'е ніхто.

І мы адразу палюбілі гэтага чалавека. Назаўсёды. А тое слова, ягонае — раскрыю сакрэт — лягло ў аснову адной са сцэн маіх "Каласоў", дзе ідзе спрэчка аб беларускай музыцы.

Ён грамадзянін. Калі б ні прыйшоў да яго — ён заўсёды паможа. Ніколі ён не абмяжоўваўся адной музыкай.

Але перш за ўсё — Яна. Першая і апошняя яго любоў. Яго мара, яго пяшчота, ягоная душа, гарачае сэрца ягонае. Маці, што выхавала яго, і дзіця, над якім ён дрыжыць.

Дзякуй Вам да імя беларускай песні, якая перамагла. Дзякуй Вам ад імя ўсіх нас. Жывіце яшчэ сто год на радасць нам, лятучая наша песня, наш дарагі дзядзька Рыгор.

Слова пра Шолахава

Міхаілу Аляксандравічу Шолахаву семдзесят гадоў. Неяк не верыцца. Хай гэта будзе труізм, але вечная маладосць генія (не пабаімся сказаць такое) прымушае забываць пра ягоны ўзрост.

І цяжка пісаць пра яго, асабліва ў рамках часопіснага артыкула. Пра яго напісалі і яшчэ напішуць сотні кніг. Як пра кожнага сапраўднага Майстра. Ды яшчэ і не кожнаму гэта будзе дадзена: сказаць пра яго так, як належыць. Таму я і не называю гэта артыкулам, а лічу ўсяго сваёю маленькаю думкаю пра Майстра.

Іншым, можа, найболей падабаецца "Узнятая цаліна", "Данскія апавяданні" або "Лёс чалавека" (бо гэты лёс падобны на іхні). Я ж хачу сказаць аб найбольш выдатнай з'яве ў творчасці. М.А. Шолахава — аб яго "Ціхім Доне". І нават не аб усёй гэтай кнізе (гэта рэч — неабдымная, паколькі "Ціхі Дон" — "кніга стагоддзя"), а толькі пра аднаго чалавека з гэтай кнігі — пра Грыгорыя Мелехава.

З самага пачатку ў некаторых літаратуразнаўцаў чамусьці склалася думка, што гэты герой — "образ колеблющегося середняка".

А давайце падумаем, ці так гэта? Хто перад намі? Слабы сераднячок, які "заблытаўся і бегаў туды-сюды"?

Справа больш складаная, як і больш складаная была эпоха, якую з такім глыбокім, пранікнёным майстэрствам паказаў нам Шолахаў.

Перад намі Чалавек. Жывы. Больш жывы, чым кожны з нас, хаця мы існуем у плоці і крыві, а ён ажыў толькі пад пяром аўтара. Неперавершанага мастака нашай прозы.

Паўтараючы словы майго прафесара Б.Ц.Малышава, хочацца назваць Мелехава "мятущимся искателем истины". І менавіта гэтым ён і дарагі нам, Грыгорый Мелехаў, змагар супраць не ўсвядомленага ім свайго ж шчасця.

Усім вядома, што такое было данское казацтва. Аблытанае царызмам, які навучыў яго лічыць амаль усіх істотамі ніжэйшай пароды. Саслоўе бізуна і шаблі.

І ўсе помняць, як без патолі рыдаў Мелехаў, пасекшы матросаў:

— Браткі, дабіце мяне!

Бо не мог не біцца, бо эпоха была эпохай жыцця і смерці. І — адначасова — не мог не плакаць па братах.

Вядома, няма класа без асоб, якія ў яго ўваходзяць. Вядома,

законы класа нібы выяўляюцца ў асобе і робяцца законамі асобы.

Але ёсць асобы, якія, што б ні выпала на іхнюю долю наканаваннем гістарычнай неабходнасці, высока нясуць сваё званне Чалавека.

Такі Мелехаў. І вялікі пісьменнік першы сказаў пра гэта.

Кім бы ён, Грыгорый, ні быў — ён асоба. Ён кінуў выклік хутару, бацьку (памятаеце, як Панцялей Пракопавіч рабаваў?), Дону, ды ці мала каму яшчэ? Выйшаў на бітву з паскудненькай мараллю, з кулацтвам, з чэрствасцю, з разбоем вайны, з разбоем звычаёвага ўплыву на душу Чалавека. І перамог.

Савецкая ўлада па чысціні сваёй ідэі, ясна ж, яму бліжэй за ўсё. Рэвалюцыя павінна перамагчы "любой цаной" (Падцёлкаў). І не "заўтра", а сёння. Павінна панаваць праўда рэвалюцыйнага гуманізму.

Грышка Мелехаў — чалавек. Чалавек, над гонарам і сумленнем якога ні ў кога няма права здзекавацца.

І якога, аднак, жорстка малолі жорны цяжкай эпохі.

Забудзецца па часе многае. Але Чалавека будуць памятаць вечна.

І Мелехаў — Чалавек з "Ціхага Дона" — будзе жыць, пакуль будуць жыць на зямлі людзі.

І пісьменнік Міхаіл Аляксандравіч Шолахаў будзе жыць, пакуль будуць жыць на зямлі людзі.

Узыход на вяршыні

Трохі лірыкі аб мастаку

Мастаку Георгію Паплаўскаму прысуджана індыйская прэмія імя Джавахарлала Нэру. Ён адкрыў Індыю вачам беларускага гледача, а пасля "заваяваў" Індыю, сэрца Індыі сваімі рукамі, рукамі аднаго з найлепшых графікаў Беларусі (як пра аўтара карцін мы тут пра яго казаць не будзем).

Чаму так здарылася. Мне здаецца, не толькі таму, што ён талент і псіхолаг, што ён умее бачыць, а і таму, што рукам ягоным дапамагаюць ногі нястомнага падарожніка. Хаду гэтых ног адчувалі не толькі дарогі Беларусі, але і дарогі Кубы, Аўстраліі, Фінляндыі, шматлікіх іншых краін і вось, урэшце… Індыі.

Ён усё жыццё нібы шукаў сябе. Аджывалі пад яго рукой і ніколі ім не бачаныя людзі старажытнага Полацка, казачныя дзяўчынкі з мудрымі варонамі, умоўныя, але якія ж жывыя "Дзяды і бабы". І людзі Трасцянца, і партызанскія лагеры.

Ён дужа розны на гэтых шляхах. Часам гэта яму шкодзіла. Гэта розныя мастакі. Паплаўскі казачнік ("Лясны бацька"), Паплаўскі марскі ("Аснастка трала"), той, які "страшыць" ("Варатар"), суровы ў ваенных рэчах ("Брэст. 1941"), млявы ("Чэрвень"), бязмежна гаротны і пагрозны (цыкл "Трасцянец"). Я нават сяк-так, з вялікаю нацяжкай, мог бы падшукаць аналогіі. І ўсё ж паўсюль ён — гэта ён. А розны ён таму, што ўсё жыццё шукае і шукае, што нягледзячы на свае сорак тры, ён расце. І будзе расці ўсё жыццё, колькі яму яго ні адпушчана. Таму што аднастайна акадэмічным яго ўвогуле ўявіць сабе цяжка.

І яшчэ Паплаўскі космасу. Не таго, які бачылі касманаўты, а таго і сённяшняга, і заўтрашняга, і космасу такога далёкага дня, што мы яго не можам уявіць, бо нават самае смелае ўяўленне будзе здавацца абстрактным. Пачынаючы ад "Ікара", які лунае, як перыйка пад чорным сонцам, над сучаснымі небаскробамі, ад труб Бюракана, нацэленых у неба, — і далей, і далей…

У 1971 годзе ногі занеслі Паплаўскага на пыльныя і бетонныя дарогі Індыі, да яе вялікіх гарадоў, малых гарадоў і вёсак. Пасля гэтай паездкі з'явілася шмат малюнкаў, літаграфій, афортаў і акварэляў. Гэта і быў "Індыйскі дзённік" мастака.

Каму ж, як не яму, было даць для ілюстравання старажытную (VI? ст.н. э.) кнігу табільскіх двухрадкоўяў, якія прыпісваюць Валювару, кнігу "Цірукурал".

Вось яна. Ажно рукі лашчыць. І вочы. Сінявою і золатам вокладкі, бледна-бледна зеленаватым фонам ілюстрацый, плаўнасцю і акругласцю лініі, сапраўдным, непадробна-індыйскім каларытам таго, што стварыў мастак.

"Ува ўсёй сусветнай літаратуры наўрад ці можна адшукаць збор афарызмаў, роўны гэтаму па высокай мудрасці", — сказаў Альберт Швейцэр. І сапраўды, гэта праведнасць, мудрасць, любоў.

Ці лёгка ілюстраваць такое? Дужа цяжка. Але мастак справіўся. Брахманы, гандляркі, танцоўшчыцы, жанчыны з ношаю, словам, усе дрэвы праведнасці, кобры мудрасці і паўліны кахання, уся шматаблічкая Індыя.

Пачынаюцца індыйскія лісты. Сам Паплаўскі так сказаў пра іх: "Індыя не толькі сонца, не толькі фарбы, рытмы, песні. Індыя не толькі… мудрасць і воля, узвышанасць і мужнасць, мінулае і будучыня — вобраз Індыі, вобраз Зямлі і Чалавека, вобраз Пачуццяў і Веры вялікага народа. Мае работы — гэта роздум…"

Так, гэта роздум над Індыяй, над яе лёсам, праблемамі, над яе мастацтвам, над яе людзьмі, над тым, што яе чакае.

Партрэты. Не кажу пра майстэрства. Але, мяркуючы па "Рою Чаўндхуры", падабенства незвычайнае, нягледзячы на бегласць. І якое вернае спасціжэнне душы.

Але партрэты не галоўнае. Галоўнае — аблічча Індыі. Грандыёзныя "Бан'яны", у цяню якіх дрэмлюць буйвалы ("Пад сенню Бан'яна", "Бан'ян"), і адчуваеш, якое гэта дрэва зялёнае, якая настоеная стагоддзямі цень пад яго кронай. Вёскі, дзе хаты падобныя на грыбы ці на старыя вуллі-калоды. Пальмы, што як ні пераломяцца пад цяжарам кроны.

І народ Індыі. Шматпакутны, за тысячагоддзі намучаны, як, мабыць, ніхто іншы, але горды і таленавіты, працавіты і высакародны. А ў гэтым і зарука таго, што з прыходам новых часоў ён пабудуе Шчасце.

Адчувальны звон цыкад, гандляры гаршкамі і шарамі, рыбакі, вясковыя тачыльшчыкі, ганчары. Уся гэта мнагаязыкая, стракатая, бедная і багатая, шумлівая і працавітая, гандлёвая (божа, якая таўкучка і гамарня — так, гамарня, хаця яе і не чуеш — на "Чайным базары ў Мадрасе"!) і думаючая краіна перад намі. І людзі яе не толькі "Соль Бенгаліі". Яны — соль зямлі.

Індыя!

Яе "Горы багоў", яе "Дажджы", да якіх жанчыны цягнуць зграбныя ломкія рукі, яе "Рытмы" і фарбы, яе лініі і гукі.

Цудоўныя рэчы! Не кажу ўжо пра работы жывапісныя, такія, як "Палёт белай птушкі". Сярод іх трапляюцца рэчы сапраўды высокага класа.

Так што мастак Георгій Паплаўскі законна і сумленна

заваяваў высокую сваю ўзнагароду. На гонар сабе і на радасць Беларусі.

І таму няхай ён і надалей — і як мага надалей — працуе на яе гонар.

Таму што ён не толькі многа зрабіў для гэтага. Ён яшчэ і наблізіў да нас легендарую Індыю. Ідныю Паплаўскага.

А цяпер — нашу Індыю.

Цёплы жнівеньскі поўдзень

Максіму Лужаніну — шэсцьдзесят год

Пад балкончыкам дачы цвітуць ліловыя, бэзавыя, белыя флёксы. Між іх цёмна-зялёныя плямы: кучаравая лістота півоняў, якія ўжо адцвілі. І далёка відаць дачныя дахі ў засені дрэў, стужачкі сцежак, а за ўсім гэтым — перакацістыя, мядзведжыя гарбы ждановіцкіх лясоў. Часам, нібы праз сон, далятаюць аднекуль галасы, прыглушаныя парнай цеплынёй. Грувасцяцца над лесам аблокі з гарачымі прасветамі ў іх. Збіраецца на дождж.

…Цёплы і добры жнівеньскі поўдзень. Ва ўсім пачатак яснасці і празрыстасці, калі далёка відаць.

Гаспадару хаты — ён стаіць побач са мной, успёршыся на парэнчы, — скора шэсцьдзесят. Поўдзень жніўня. Час пачынаць збіраць ураджай і сеяць на будучае. Досыць далёка ад таго лістападаўскага дня 1909 года, калі нарадзіўся ў вёсцы Прусы на Случчыне будучы паэт Максім Лужанін, а тады папросту Алесь Каратай. Досыць далёка. Але яшчэ далёка і да восені.

Плённы спакойны час. Спакой у рухах, у абліччы, у разважлівых вачах, у сівізне. Ну і дзякуй богу, што спакой і плён, што ў гумне ўсё болей і болей прыбывае снапоў, што сэрцу ўсё яшчэ рупіць аб новай працы, што яшчэ многа яе. Бо кожны з нас у глыбіні душы, хай сабе ў закутачку яе, селянін, чалавек, які дбае.

Што з таго, што я назапасіў, нарыхтаваў яму стандартных пытанняў: як пачыналася творчасць, у каго вучыўся, якія лепшыя вершы, што дала ў жыцці кніга? Я ж ведаю, што зададзенасць ніколі не даводзіла да дабра, што, як заўсёды, лепшае — гэта шчырая бяседа.

Проста бяседа. Проста бяседа двух мужыкоў на прызбе ці недзе на бярвеннях. За тытунцом. Пра тое, што цікава нам абодвум, і не толькі нам, але і ўсім іншым хлебаедам. Пра снапы. І паводдаль ад іх. Каб, крый божа, не згубіць іскры.

Ён дужа даўні мой знаёмы. З часам, калі розніца ва ўзросце сціраецца, узрастае і цікавасць да думкі другога. Малому з дваццацігадовым не сябраваць, але ўзаемнацікавыя адносіны паміж сарака- і шасцідзесяцігадовым. Думаецца, нам цікава адзін з адным, у жывой сувязі.

Пачыналася тое знаёмства аднабакова. Памятаю першыя пасляваенныя старонкі "Беларусі". 64 старонкі кепскай паперы, дрэнны друк (якія бедныя і якія багатыя мы тады былі!).

І як жа мы любілі гэтую шэрую, плямістую, сіваватую паперу! Дзіўныя там сустракаліся рэчы. Пераглядаючы, даведаешся, напрыклад, што Кузьма Чорны пісаў артыкул пра слуцкія сурвэты.

Вось там і натрапіў я на імя цяперашняга майго субяседніка. Можа не ўпершыню, але ўпершыню з такім пранікненнем. 1946 год — верш "Драч".

Жывучы на чужыне, быць можа, няслушна,
Недарэчна, але не адгоніш, хоць плач,
Набіваецца дзіўная песенька ў вушы,
Ўспамінаецца мне невялічкая птушка —
Драч.
Ён не майстар лятаць, а вясна яго гоніць
Да тых самых мясцін, дзе калісьці ён жыў,
Дзе ён бегаў, хаваўся у жыце зялёным,
На той самы палетак, на тыя загоны,
У гняздо на той самай знаёмай мяжы.
Час не зводзячы, ён выбіраецца пешкі,
Прамінае Еўропу за ноч пехатой.
. . . . . .
Мы пабачылі свету і шырай і далей,
Але помніцца сэрцу пачатак хады:
Тут нас маці раджалі, тут мы вырасталі,
Тут мы самыя лепшыя песні складалі,
Тут паплачуць сябры, несучы на клады.

Да канца зразумелая была мне тая туга на чужыне. Сярод сухіх стэпаў успомніш крыніцу на беразе Дняпра, зялёны адбітак гор у ягонай вадзе, кароў, што ідуць па гэтай зелені дагары нагамі, - сэрца сцісне, а вочы мокрыя!

І не разумеў я, і ніколі не разумею людзей, якія па сваёй ахвоце кідаюць гэта. Як бы лепей ні было паводдаль, чалавек павінен жыць і памерці ў тым наваколлі, дзе ступалі ягоныя босыя ногі. Свая зямля заўдасць пакуты, яна, як сваяк, ведае ўсе твае слабыя месцы, яна можа зачапіць за сэрца — але яна ж і вылечыць. І ты створаны, каб жыць з ёю. На шчасце і на гора, на жыццё і на смерць.

Яна ўсялякая. Але яна твая, і іншай не дадзена табе. Не ведаю, як хто, а я праз месяц не знаходзіў бы месца з тугі, ведаючы, што мне не дадзена вярнуцца на яе, на яе лугі і ўзгоркі, межы і рэкі, да яе лясоў, да яе простых людзей.

Вось гэгы боль я і адчуў тады ў вершы невядомага мне чалавека. Усё гэта магло б быць усяго эпізодам. Тады пісалася ўсім. Агульны боль, агульная журба па знявечанай, мілай сваёй

зямлі нараджалі літаратуру, нараджалі еднасць чалавечую.

Нездарма ж у таго самага Максіма Лужаніна адзін з найлепшых твораў — "Праводзіны" — створаны амаль адразу, калі яшчэ не ступілася гора, агульнае наша гора па дзядзьку Якубу. Не ўсе, на жаль, зрабілі з гэтага высноў. Іх творы так і асталіся на тых зжоўклых старонках. Памог гэтаму і час. Цяжка было выцярэблівацца са старой манеры. Лепшыя выцерабіліся, хоць, вядома, не без страт.

Чаму так здарылася? Я думаю, таму, што ў паэта Максіма Лужаніна быў корань. І не ў сэнсе паходжання, зямлі, вёскі, чысціні мовы — хаця было і гэта, — але і ў сэнсе вернай настройкі душы.

..Бязмежная слуцкая роўнядзь. Чарназём і цяжкі, плодны лёсавідны суглінак. Адвечная жытніца. Мала рэк і лясоў. Над калючымі іржэўнікамі крыжы ветракоў, на якіх ад веку да веку канае, каб тут жа ўваскрэснуць, жытні распяты бог. Вечна круціцца і вечна канае.

Земляроб, працаўнік не быў пачасту багатым. Але зямля давала сілу зямную, што не будзе плакаць, калі кепска. Як у тым народным анекдоце.

Згарэла гумно, поўнае снапоў. Згарэла праца за год. Мужык стаіць над папялішчам і божкае:

— Ну й пагарэў ты, Яўхім! От жа пагарэў! Вой, пагарэў!!!

І адразу ж за тым:

— Але ж затое і мыш-шэй ляснула!!!

Чорта ты з ім, з такім, зробіш!

Цікава тое, што — народ. І самі мы цікавыя толькі тым, у чым мы — народ. І не так ужо награшыў супроць ісціны мастак Лісоўскі, намаляваўшы М.Лужаніна, Я.Брыля і яшчэ кагосьці за сталом з відэльцамі ў руках. За грубым сялянскім сталом. Босых. А П.Пестрак нясе ім загорнуты ў ручнік чыгун з бульбай. Тут яно, магчыма, і ёсць самае наша: прачнуцца раніцой і, яшчэ не расплюшчыўшы вачэй, пачуць глухі звон патэльні і пах аладак…

І ўражанні ў нас, людзей аднаго кола, падобныя, пачынаючы ад самых першых, дзяціных. Ад няяснай цягі да агнёў далёкага горада, ад кнігі з самых ранніх год, ад зімовых замёрзлых вокан.

Усё тое ж, што, з невялікімі варыяцыямі, было ў кожнага. Шэршні ў дупле старога дуба, якіх выкурваеш запаленай паперай. А яны, баронячы дом, кідаюцца на цябе і балюча джгаюць, і трэба шукаць паратунку ў цёмнай вадзе копанкі. А дуб раптам зоймецца агнём, і вецер нясе іскры на драўляную царкву, якую ледзь шанцуе ўратаваць. А там ужо багаборцу, хай і несвядомаму, дастанецца бацькавай папругі. І ідуць адразу за такім апавядяннем іншыя, падобныя, аж да разрытага, відаць, барсуком,

гнязда земляных восаў, ля якога ляжаць з'едзеныя ім соты: пажмаканы воск у яловай гліцы.

А песні вясковыя, якія пасля хочаш не хочаш, але абавязкова адаб'юцца ў тваіх, будуць гучаць у вушах тваіх удзень і трызніцца ўначы. Увесь ты ад іх, і тут ужо нічога-нічога не зробіш.

А гэтая першая і апошняя любоў да Купалы і паэм Коласа. Мне, напрыклад, давялося бачыць Купалу ўсяго адзін раз, а Коласа — разы тры-чатыры. Максіму Лужаніну пашанцавала ў гэтым сэнсе куды больш, а з Коласам ён некалькі год быў дужа блізкі. Сведка гэтаму — выключная кніга "Колас расказвае пра сябе", твор дужа рэдкага, пакуль што, у беларускай літаратуры жанру. Шкада, што многае з вусных апавяданняў паэта пра другога паэта не ўвайшло ў кнігу. Але, можаце мне паверыць, гэта выдатныя апавяданні, смешныя і кранальныя адначасова.

Вобраз чалавека і паэта паўстае з іх. Без німба. Жывога. І вось так, жыва, хацелася б гаварыць пра ўсіх, з кім звёў цябе на нялёгкай тваёй дарозе жыццёвы лёс.

…А мы гаворым і гаворым. І пра салоныя, часам досыць злосныя, эпіграмы, і пра смаржкі, якія збіралі пад Сінілом, і пра слуцкія бэры — "раскрые дзядзька кош — увесь рынак пахне". Словам, пра ўсё тое, што, не менш чым вершы, складае літаратуру, бо ўзнаўляе атмасферу, без якой тая літаратура не можа дыхаць.

Мы ствараем цяпер свае ўспаміны. Нараджаюцца новыя літаратурныя легенды, з'яўляюцца нават новыя фальклорныя героі ад літаратуры. Але мы мала ведаем пра легенды 20-х — 30-х гадоў, пра побыт, пра жыццёвыя анекдоты, пра характары літаратараў таго часу. І дужа добра было б, каб чалавек з вострым вокам і памяццю, з пачуццём гумару расказаў бы пра тое, што адыходзіць з часам. Адкуль жа пазнаваць нам атмасферу спрэчак, самое паветра тагачаснага жыцця, вуліцы, дамы, тыпы старога Мінска, Полацка, Слуцка…

Трэба расказаць не толькі пра Коласа.

Перажыта шмат. Былі нялёгкія гады перад вайной. І сама вайна…

Чалавек часам не дабярэ рады, як жа трэба расказаць пра сябе. Вось колькі сказаў аб тым, як паэта на фронце засыпала выбухам міны ("Гэтак яно і рабілася", у зборніку "Пяцьдзесят чатыры дарогі"). І ані слова аб тым, што ён потым расказваў мне: як, знямогшы без тытуню, закурылі пад шынялём, ды, відаць, знячэўку 6ліснулі. Пачаўся такі мінны абстрэл, што аж засыпала па плечы. Сам не мог вылезці і выбавіўся толькі падазваўшы свайго каня і абхапіўшы яго за шыю.

…Чыталі вершы… Бэзава цвіў верас у вазачцы на жоўтым

століку. Ляжалі на стале спісаныя блакноты і дзённік з замочкам і залатым абрэзам ("божа мой, чаму ў мяне няма такой бякешы!?"). У паэта ў гэтых справах ёсць некаторы артыстызм, уласцівы многім пісьменікам: культура добрай аўтаручкі, ільснянага чорнага чарніла, белай або колеру слановай косці гладкай паперы. Каб думка не сустракала перашкод, бегаючы разам з рукой, выліваючыся з чарнілам на роўнядзь папяровага ліста.

А за вокнамі мансарды — цеплыня і яснасць жнівеньскага дня. Побач са зборнікам Дануты Бічэль (чытаў, відаць) — новыя вершы. Свае. Адна паэма пра апошнія дні Купалы.

З купалаўскім эпіграфам — усе яго помняць — аб тым, што не трэба напуста наракаць на свой лёс… каб не клялі нас праўнукі. Аб ад'ездзе ў эвакуацыю, аб тым, як замест клункаў браў Купала алоўкі… Пакінуць Радзіму… Самае гаротнае, што можа быць у чалавека. Слухаеш гэта і ясна бачыш, як плыве з прыгаршчаў аршанскі пясок, як астаюцца званочкі ў збанку ды далягляд у душы. Той далягляд, які так і не здолеў узяць з сабой.

З часам усё лепш разумееш, што для вялікага верша і прычына павінна быць вялікая. Уражанне, якое перапаўняе душу, скручвае ўсё ў ёй, сціскае сэрца і горла. І шчасце таму, хто зразумее гэта раней. На жаль, такіх шчасліўцаў няшмат. І не ўсе яны могуць адгукнуцца сэрцам людскім і вушам чалавечым па гарачых слядах, адразу ж сказаўшы тое, што патрэбна вось сёння, вось зараз, вось у гэта імгненне.

Ёсць сотні добрых вершаў пра смерць Пушкіна. І, аднак, усе яны крыху адступаюць перад "Он лежал без движенья…" В.Жукоўскага, "На смерть поэта" М.Лермантава, "28 января 1937" Цютчава. Уся справа ў тым, што гэта створана тады, калі грамадства было яшчэ непасрэдна ўзрушана трагедыяй, калі шматпакутныя рукі паэтавы не паспелі яшчэ аледзянець у труне, пад пякучым студзеньскім снегам.

Але ўсё ж гэтыя тры класічныя вершы яшчэ не прычына, каб пра вялікую смерць не пісалі зноў і зноў. І справа не толькі ў тым, што на змену свежаму болю прыходзіць з часам усё большае ўсведамленне таго, што адбылася ў той дзень нацыянальная трагедыя. Справа яшчэ і ў тым, што з адлегласці ўсё яснейшыя робяцца абставіны, накопліваецца ўсё большая колькасць асэнсаваных фактаў, з'яўляецца ўсё большая магчымасць даць ім належную ацэнку, сказаць шчырую праўду.

Пра апошнія месяцы жыцця, пра смерць Купалы будуць яшчэ пісаць і пісаць, але няма сумнення, што Максім Лужанін сказаў тут сваё вагомае слова.

Сказаў з талентам, праўдай, сардэчным болем і шчырасцю, той, якая паспела б і з фронту падбегчы, каб падхапіць чалавека і

паэта, які бачыў сваім позіркам "усю Беларусь, неаб'ятну, як мора".

Хто ведае, як нараджаецца ў паэта дзіва верша. Тэорыі тут нічога не могуць растлумачыць. Бывае, што верш выльецца ў адзін дзень (як тыя ж "Праводзіны"), а бывае — аж вось калі, праз чвэрць стагоддзя.

Адкуль гэта пачалося? Ад партрэта ў чорнай рамцы? Ад страшнага супадзення, што маці ў акупацыі памерла ў адзін дзень з сынам, быццам падсвядома адчувала, ведала і не магла перажыць? Можа і так: узяўшы, на адным краі свету, за руку сына, матку, на другім краі свету, бярэш за сэрца… А можа на пушкінскіх урачыстасцях, на адпяванні ў Святагорскім манастыры, калі стаіць, здаецца, між людзей нябачная труна і сівы чалавек спявае песні тых часоў.

Я рад, што пачуў гэта. Таму што… можа і не месца казаць пра такое ў дзень гадавіны, але трэба. Менавіта таму, што я не ўрачысты артыкул і не юбілейную оду пішу, а спакойна і бесстаронна разважаю пра чалавека і паэта.

Я неяк не належаў да палкіх прыхільнікаў усёй, агулам, паэзіі Максіма Лужаніна. Лічыў, што на першым месцы ў яго проза ды майстэрскія пераклады. З паэзіі вылучаў некалькі дзесяткаў першакласных вершаў. Астатнія лічыў моцна і грунтоўна зроблены мі, але крыху разважлівымі і халаднаватымі (гэта не датычылася, вядома ж, "Ручая", "Драча", "Каштаноў" і іншых такіх, што не адзін я лічыў вершамі для анталогіі).

Мабыць, і сам ён, як і ўсе мы, многае б зараз рабіў іначай. Віна тут не толькі ягоная. Цяпер, асабліва пасля новых вершаў, новых паэм, якія чуў, думаю, што шмат у чым памыляўся. Гэта лепшае, што калі-небудзь было напісана паэтам. І гэта, створанае літасцю божай, нібы асвятліла і ўсё астатняе. Але пра гэта крыху пасля.

Калі ж гэта мы пазнаёмі.ліся? Чатырнаццаць год таму. На нарадзе маладых. Стаяў у зале Саюза пісьменнікаў доўгі стол, і за ім сядзелі маладыя і немаладыя ўжо людзі. Там былі паэты, кампазітары, дзеячы сцэны. Сярод іх я заўважыў чалавека, які сядзеў спіною да дзвярэй, далёка наўскос ад мяне. Светлага, колеру кавы з малаком — ну, можа крыху і фісташкавага колеру — гарнітур, залатыя запінкі ў дзіўна неяк, мякка выкручаных манжэтах белай сарочкі. Больш рыжынкі ў валасах, як цяпер больш сівізны. Увесь час ён папраўляў гэтыя манжэты, нават слухаючы вершы, а па твары нельга было зразумець, падабаецца яму тое, што чуе, або не. Нібы нават не вершы слухаў, а з журбою думаў пра жыццё.

Выступаў ён і па маіх вершах (о, успомніў! дваццаць першага

верасня 1955 года было гэта). Даваў, між іншым, і за тое, за што варта было даць, ды і без усякага шкадавання: за варварызмы ў мове. У прыватнасці, за тое, што ляпаў я зусім бессаромна мяккі знак у дзеяслоўных канчатках. А за такое і зараз не шкодзіла б сім-тым выдаць. Мова — твой інструмент, то ўмей ім валодаць, калі ласка, і не бяры чужога слова і чужой формы, шукай сваю.

Нарада тая, падалося мне, не вельмі яму спадабалася. Наколькі памяць не падводзіць, гаварыў ён пра неаб'ектыўнасць абмеркавання творчасці тых-сіх паэтаў, пра захвальванне вершаў некаторых людзей, якія толькі і бяруць, што самаўпэўненасцю і ўяўнай, вычварнай прыгажосцю. Гаварыў аб тым, што не ахоплена было шмат людзей, што за аснову трэ было браць не творчасць прыезджых толькі, а самае цікавае, каб вучыліся маладыя.

На заключным вечары Лужанін чытаў сваю "Вільнянку". Верш мне падабаўся, дый чытаў ён яго добра.

Вось тады недзе нас і пазнаёмілі, і мы перакінуліся дзесяткам-другім слоў.

А пасля пайшло ў нас усё не так. Настолькі не так, што каб год шэсць назад нехта сказаў мне аб гэтай размове і аб гаворцы маёй пра яго — я засмяяўся б яму ў вочы. За бліжэйшым знаёмствам, здавалася б, разважлівых людзей, якія ведаюць цану сабе і суседу, прыйшла недарэчная непрыязнасць. Урэшце, умовы кіно могуць каго хочаш штурхнуць на такое.

А тут яшчэ пры павазе да работы калегі, было непрыняцце некаторых яго поглядаў.

Мне, напрыклад, хоць я лічыў і лічу паэта яшчэ і разумным, цікавым крытыкам, дужа не падабаецца ягоны артыкул пра Кузьму Чорнага. Яму не падабаецца мой сцэнарый "Гнеўнае сонца". Ну і што? Гэта ж яшчэ не прычына. Але як часта яшчэ ў нашым асяроддзі вырастае з гэтага нецярпімасць, якой не павінна быць хаця б таму, што галоўнае, чаму павінен вучыць пісьменнік, — менавіта цярпімасць і чалавечнасць.

Сорамна зараз прызнацца ў гэтым. Сорамна і пісаць. Але з адносін нашых гэтага не выкрасліш. Ды, зноў жа, трэба, каб не думалі, што гэтае эсэ — юбілейшчына. Хачу, каб паверылі, што на гэтых старонках няма ніводнага няшчырага слова.

Што ж, тым большая цана нашым цяперашнім добрым адносінам, Адносінам узаемнай павагі.

Дзякуй сябру! Пад час паездкі нашай у Брэст ён прывёў паэта ў наша купэ, а пасля, з учасцівым яму талентам не абы-якога дыпламата не толькі знік сам, але і паклікаў астатніх. Сядзець проста так, за чаркай каньяку, глядзець у ноч, дзе нічога не відаць, акрамя квадратаў вокан, што бягуць па зямлі, ды маўчаць — гэта вельмі смешна і недарэчна. Пачалася размова, падобная

спачатку на размову людзей, якія тыдзень таму навучыліся гаварыць. І стала тут зразумела, што мы — людзі, дый яшчэ не зусім з апошніх, і для абодвух значна лепей было б даць волю павазе, якую падсвядома адчувалі адзін да аднаго, бо, па справядлівасці, не маглі ўвесь гэты час прымусіць сябе да іншага. Даць волю зычлівасці, яснасці, сказаць адзін другому шчырае слова. Так яно і здарылася ў тую вагонную ноч з плямамі вокан, што беглі па маладой яшчэ лістоце дрэў насустрач адвечнаму разліву пушчы.

Вось так і пачалі нараджацца за час, пакуль прыйшлі ў вагон сябры, а пасля ў пушчы, і ў дарозе, і на гарадскіх вулках, і ў цішыні каралішчавіцкіх лясоў узмацнелі — новыя адносіны.

І мне сталі па-чалавечы зразумелыя і ягоны запал, і ягоны халадок, і ягоны скепсіс (а яму ж былі прычыны, ды і колькі яшчэ), і ягоная вера, наша, агульная вера. І нават грунтоўнае майстэрства радка (мне, разбоўтанаму, яно здаецца нават празмерным, бо, так здаецца мне, крыху шкодзіць непасрэднасці, уражанню, што верш вось тут, вось адразу, нібы сам сабою выліўся на паперу; уражанню, мабыць, усё ж памылковаму).

А яшчэ высокая культура радка, рытму, рыфмы, што ў наш час занядбання гэтых каштоўнасцяў, непавагі да іх і разлайдачанай неахайнасці цэніцца знаўцамі і проста аматарамі асабліва высока… "Распрыгонілі верш". Хоць, на самай справе, у некаторых паэтаў гэта проста ад няўмення стварыць нешта вартае, ад дрэннага ведання азоў рамяства, ад ляноты рабіць нешта грунтоўнае, зладжанае і гарманічнае, ад нізкай культуры.

Радасна, што так здарылася, што чалавек і паэт зліліся ў адно. Гэта, вядома ж, не абавязкова. Можна высока цаніць майстэрства паэта і ані ў шэлег не ставіць чалавека.

…Гэта адзін з самых культурных і абазнаных літаратараў, якіх я ведаю. І не толькі на Беларусі. І дарэмна ён наракаў на сябе ў аўтабіяграфіі, што не скончыў там нешта. Некаторым пяць універсітэтаў не памогуць. Ёсць нешта вышэй. Самы лепшы універсітэт, які нічога не замоўчвае і нічога не падае ў скажоным святле, — гэта сумленная кніга. І калі гэта так (а гэта так!), то наш паэт — паэт-знаўца, паэт-кніжнік, паэт-вучоны. Нездарма самыя розныя людзі, талент і веды якіх я высока цаню, непарушна вераць у высокую пробу ягонага густу, у беспамылковае ўменне разбірацца і ў інтуіцыю.

Нясуць яму свае рукапісы, прыслухоўваюцца да яго думкі, шукаюць ягонай парады.

Гэта жыццё з кнігай, аж да багацюшчай уласнай бібліятэкі, да якой я ўсё думаю дабрацца, каб пакапацца ў ёй, каб падумаць над рэдкімі старонкамі.

Колькі ўсяго было — аж не ўспомніш. Заснежаны каралішчавіцкі лес, хатняе сала на стале, агністая вавёрка, што заглядае ў акно, і дасціпная разумная бяседа. Аб усім. Аб вершах і сябрах, аб прышчэпках дрэў і магчымасці зрабіць прышчэпкамі на адным камлі дрэва-сад.

Успамінаю на беразе зялёнага става ў Нарачанскім краі цяністую траву між старажытнымі стадоламі, складзенымі з няроўнага грыфельнага і ружовага граніту.

Здымалі фільм, і таму паўсюль над гэтай зялёнай травой цяжка валюхалі або стрэламі імчалі татарскія коннікі з шаблямі і круглымі шчытамі, зверападобныя, у футравых башлыках, з грывамі чорнага конскага воласу, што падалі на твар і плечы.

І гэта было страшна.

А побач было і смешнае, і мы, разлёгшыся ў траве, глядзелі. На возе рэпеціравалі сцэну бойкі нашы трукачы: рабілі сальта, давалі адзін аднаму падножкі, выкідалі з воза, схапіўшы за азадкі. Мы аж качаліся па дзьмухаўцы і дзікім кмене і рагаталі.

Рабочыя нашы хадзілі ў зялёным стаўку з брэднем, цягалі дробных залатых карасікаў, палонікаў — ужо нават жабак, але яшчэ з хвастом — і цэлыя горы твані. Калгаснікі, што падышлі, паглядзелі на іхні ўлоў і са знішчальным гумарам прадэкламавалі:

Рыбакі лавілі рыбу,
А спаймалі жорава…

А працяг быў такі, што мы, не чакаючы далейшага знішчэння словам, ірванулі адтуль, як ад чумы. І гэта пры нашай страсці да жывога, салонага народнага слова.

Мне прыйшла ў галаву дзіўная думка. Аб новых, свежапрыдуманых словах у беларускай мове. Вось, напрыклад, вычытанае з дарэвалюцыйных календароў "угодкі". А як будзе той чалавек, чые ўгодкі святкуюць? Нехта сказаў бы: "угоднік". Яно можа і праўда, бо ўсе мы ў такіх выпадках выглядаем ледзь не святымі, хоць святымі мы не былі і ніколі не будзем.

Прынамсі, бяседы з ім — сапраўдныя бяседы; з вострым беларускім слоўцам, са здаровай беларускай дасціпнасцю. З гадамі больш за ўсё пачынаеш цаніць няспешную бяседу з ведамнымі, разумнымі і зычлівымі людзьмі.

Вось і тут была проста бяседа. Аб дрэвах — з Яўгеніяй Эргардаўнай, верным сябрам ягоным праз многія гады, а пасля аб грыбах — агульнай нашай страсці (выскачылі на хвілінку прабегчы запаветную мясціну: а мо ёсць, калі толькі Андрэй Макаёнак раней не выцерабіў). А яшчэ пра лес наш. Бо ў паэта

жыве любоў да лесу і веданне яго. Можа нават большая, чым у іншых, бо ягоныя Прусы — бязлесная вёска. Так дужа часта нясцерпна цягне да мора хлопцаў менавіта з тых мясцін, дзе і рэчкі сапраўднай няма.

А пасля зноў бяседа. Пра музеі, мастакоў, ды мала яшчэ пра што.

І зноў вершы. На гэты раз урыўкі з няскончанай яшчэ паэмы. Шмат гаварыць пра няскончанае — нельга, бо яшчэ сурочыш. Але я павінен вам сказаць (сплюнуўшы тры разы), што мы будзем мець добрую рэч.

Сабраны плён. Той плён, аб якім паэтам сказана:

Каб мякка спала ў глебе зерне,
Мой час на камені арэ.

Сапраўды, ворыва было цяжкае і доўгае. Таму, магчыма, тыя, каму дасталася лёгкая глеба, сяк-так адсеяліся, набілі — ці добра, ці блага — свірны і зараз пакурваюць на прызбе, склаўшы рукі.

Тут жыццё, поўнае цяжкай працы, дый само нялёгкае, выгнала паўнаважкі, васкова-залаты колас. І гэта вельмі, надзвычай прыемна. Бо куды больш пачэсны лёс рунебергаўскага Пава (памятаеце пераклад М.Багдановіча?), чым лёс тубыльца з Блажэнных Астравоў, які сядзіць пад дрэвам і ў салодкай знямозе чакае, калі ў рот яму ўпадзе з гэтага дрэва фінік. Бо адна справа нічога не зрабіць самому, жыць з таго капіталу, што ты "ўзорны дзед, узорны тата", а зусім другая — дабіцца ўсяго сваім мазалём. Разам з народам сваім, якому таксама не было лёгка.

Канва гэтай паэмы (а ў ёй пятнаццаць раздзелаў) і ёсць біяграфія народу, пададзеная праз біяграфію чалавека, праз вечнае паэтычнае "я". Галоўныя, апорныя пункты нашага жыцця. Ад "цароў з бародамі, з вусамі, з галовамі і без галоў", праз рэвалюцыю, вайну, адбудову.

Яшчэ не хапае двух раздзелаў, ды і з напісанага я чуў, вядома, не ўсё. Але пачутае пакідае моцнае ўражанне. Сапраўдная паэзія, моцна скляпаная і прастая, шматдумная і сціслая. Часам ясная, як світанак, а часам горкая і хмарная, як крыжы на беларускіх палях.

Сіла яе — у повязі з думамі звычайных. Усё ў ёй — гэта тое, што ўсе мы бачылі і перажылі. Вось у Полацку, калі паэты адчыталі, як казалі слухачы, толькі "паўзмены", ім дораць шкляны шарык, з якога робяць валакно.

— Клубок будзе ў вас, хвост ягоны — у нас. Тарганём — значыць, чаркі ўжо наліты і пірагі на стале.

Я, вядома ж, пераказваю дрэннай прозай добрыя вершы, за што трэба было б прыцягнуць мяне да адказнасці, але спадзяюся

на амністыю, калі выйдзе паэма.

Дык торгайце часцей. Нам без вас дужа цяжка, чытачы! І паэт кажа:

Калі ахвота слухаць вершы,
Дык я гатоў без пірагоў.

Паўтараю, у гэтым пачуцці еднасці, у агульнасці думкі, у кроўнай повязі з тымі, хто арэ і тчэ, — сіла новага твора і загадка яго ўздзеяння.

Калі радавацца, то разам. Калі пакутаваць, то адны з аднымі. Каб не выкошвалі, як сенажаць, прыгожы белы свет, каб не было з нашымі маткамі, сёстрамі, жонкамі зноў такога, як у паэме:

І не вылазіла з пастронкаў,
Ледзь не хадзіла пад дугой.

Гэты раздзел пра жанчыну, пра маці, пра Беларусь, мне здаецца, адзін з самых узвышаных і трагічных маналогаў у беларускай літаратуры.

Сіла твора Лужаніна яшчэ і ў прызыве да яснасці, да шчырасці чалавечай, да таго, каб на зямлі, за мільёны год спаганенай узаемнай бояззю, скрытнасцю, хцівасцю, паклёпамі, устала ўрэшце на поўны рост ззяючая ісцінай і праўдаю чалавечнасць.

У паэме ёсць раздзел пра змяю. Пра лясную гадзюку, што "стаіць, як кажуць, на хвасце". Пра тую, што не трэба выпускаць жывою — і даруюцца табе сто грахоў.

І пра тую, што атрутай капае на святую справу сяброўства, даверу, чысціні чалавечай і братэрства чалавечага.

Атрутай плёткі, падкопу, даносу, здрады.

Вось гавораць пра сумленнага, харошага чалавека — і раптам "адзін з прысутных стаў на хвост". Такі не будзе гаварыць проста, ён круціцца і сычыць, і атручаны мёд яго. Ён кажа "жыві", а думае пра "лусні". Ён вітае — нібы забівае цвікі ў труну.

Сапраўды:

Няўжо я слаба грукнуў друкам
На той сцяжыначцы лясной?

Сапраўды: "Было дабіць мне — не дагледзеў".

Што зробіш, такога не заўседы і заўважыш. Пеўнем будзе крычаць у твой гонар, кветкамі пад ногі рассцелецца, фурманам

на тваіх козлах сядзе і павязе. Ды і паплача яшчэ кракадзілам.

Граў на слабінцы беларускай:
Паплач — і будзеш мець сяброў.
Ды кракадзіл перад закускай,
А гэты перад чаркай роў.

Прыроджаная, адвеку наканаваная чалавеку, здаровая пагарда і нянавісць да ўсякага здрадніцтва, да ўсякага фальшу і ханжаства вадзіла тут пяро.

І я ніяк не дам прамашкі,
Хіба пакіну дома кій.

Словам, перажыў я рэдкае пачуццё ад сустрэчы з сапраўднай паэзіяй. Чаму не так часта, як хацелася б, прарываецца яна наверх ва ўсіх нас? Можа таму, што ў тэме жыцця, у штодзённым яго тлуме, у забыцці пра "ўчора" і "заўтра" ёй непрытульна жыць? Можа мала мы думаем пра жыццё і творчасць, а больш пра выдавецтвы і тыражы?

І рэдка надыходзіць вызваленне, каб адзіна дарагая госця прыйшла пад нашу страху.

Паэзія! Мы, паразумнеўшы з гадамі, добра ўсведамляем, што мы яе слугі. І таму лёс нашых пакаленняў пачынаць у сталасці з таго, чым пачыналі ў маладосці. А калі хопіць сілы і ўпартасці — і канчаць тым, з чаго пачыналі.

З простай радасці лесу і хаты, з бэры, з чорных вішань на сподку ("каменнае сэрца"), з сяброўства і шчырасці. А яшчэ — з высокай радасці сумленнай працы, праўды, па-сапраўднаму, з усёй сталасцю розуму і сэрца прыдбанай Радзімы, з сустрэчы з пані нашай, з маткай нашай, няўхільнай, праўдзівай, добрай, бязлітаснай паэзіяй.

Ну так, лёс наш быў няпросты. Праца, войны. Майданекі і Хатыні — усё гэта было. Усё гэта шкодзіла нам быць самімі сабой. Далёка, далёка не ўсё зроблена, што хацелася, што маглі, што спадзяваліся зрабіць у жыцці.

Плывуць гарачыя аблокі. Гоніць іх пастух-жнівень над палямі і лясамі. Млеюць у садах хаты. Нізкае ўжо сонца падае на балкон. Вакол спакой і прымірэнне.

Час брацца за новую работу. Час правіцца на яшчэ адну сцяжыну. Шмат удалага было на ёй, а будзе, павінна быць, яшчэ больш.

Шмат чаго яшчэ будзе. За гэтым балконам, над гэтымі сінімі,

з шызым налётам, над гэтымі замглёнымі ў сонцы лясамі — цёплы жнівеньскі поўдзень.

Шляхі ў палях

Дзіўная і дужа дваістая гэта справа: пісаць аб жывым, поўным сіл чалавеку, якому яшчэ крочыць і крочыць, думаць і думаць, працаваць і працаваць.

З аднаго боку, гэта цяжка: не маеш права казаць пра многае (вакол жывыя ўдзельнікі), не маеш права "абагульняць", пускацца ў асаблівыя разважанні. З другога боку — лёгка: не падвядзе памяць, заўсёды можна паверыць дату і факт.

Ёсць у гэтым жанры свае слабіны: зноў жа аб многім не скажаш.

Але ёсць ва ўсіх такіх "успамінах", "добрых словах" і адна высокая вартасць, якая перамагае ўсё. У іх нельга сказаць няпраўду.

Пры ўсёй непазбежнай вузкасці погляду, пры адсутнасці дыстанцыі — той выпадак, калі чалавек піша пра свайго сябра, якому ён можа кожную хвіліну пазваніць па тэлефоне, а то і проста ўзяць рэчы на плечы і паехаць да яго, мае адну неацэнную якасць: дакладнасць, пэўнасць.

Мне хочацца, каб менавіта гэтую якасць мела маё слова, гэтыя штрыхі партрэта майго сябра Уладзіміра Калесніка, аднаго з таленавітых сучасных нашых крытыкаў, чалавека, шлях якога не ружамі быў усыпаны і які на гэтым шляху не страціў аніводнай з высокіх чалавечых вартасцей.

Не стану разбіраць яго кніг: гэта тэма для асобнага артыкула, і пра гэта лепей скажуць калегі і час. Для мяне ён тут важлівы перш за ўсё як чалавек, з якім мы змералі шмат палявых дарог, перадумалі разам шмат думак, абгаварылі шмат важлівых праблем. Уладзімір Калеснік для мяне — адзін з лепшых людзей, з якім даводзілася сустракацца на гэтых мяккіх палявых дарогах, што ныраюць між узгоркаў, парослых канюшынай і жытам.

Пазнаёміліся мы з ім у канцы 50-х гадоў. Пачалося, па-мойму, з размовы аб маёй "Партызанскай баладзе", якая яму спадабалася. Але мне хацелася б пачаць не з першай сустрэчы і не з вершаў пра "партызанку", а з некаторых жывых людзей.

У 1966 годзе Я.Брыль, Р.Барадулін і я калясілі па Налібоцкім пушчанскім наваколлі. Начавалі ў калгасе "Зара" ў харошага чалавека Пятра Майсеевіча Шчарбакова, а пасля ўзялі з сабой Паўла Арсенавіча Жалезняковіча і паехалі па ўсёй гэтай зямлі, дзе асколкаў і гільзаў ледзь не болей, чым камянёў.

І вось урэшце вывела нас шэрая змяя дарогі да сіняга Нёмана і да зялёнай вёскі над ім, дужа залёнай, імя якой Сіняўская

Слабада. Дагэтуль мы і пасмейваліся, і проста жартавалі, і кепікі строілі (я, пішучы ў той час "Каласы…", "заразіўся" звораtам "панове" і ніяк не мог ад яго адстаць, а мае спадарожнікі пакеплівалі: "Мы тут за слова "таварышы" змагаліся, а ён — "панове-панове").

Дык вось, калі да гэтага пасмейваліся, то тут змоўклі. Таму што ўбачылі Сіняўскія партызанскія могілкі. Гэта трэба бачыць самому і маўчаць. А крыху вышэй іх, па схіле — вясковая школка, перавезеная сюды з пушчы, дзе яна служыла рэдакцыяй і друкарняй пяцём партызанскім брыгадам… А яшчэ вышэй — могілкі вясковыя, усе ў шумлівых шатах векавых хвояў.

І там, на могілках, сівая ад старасці — ля камля, мядзяная, як жар — увышыні сасна з вялізнай расчохранай буслянкай. А пад сасной — магіла. І на помніку барэльеф чалавека з простым строгім тварам. І два словы: "Андрэй Калеснік".

Барэльеф гэты адліў на бацькаву магілу сын. Валодзеваму характару гэта ўвогуле ўласціва: разнастайная, шматгранная артыстычнасць. І навука, і проста мастацтва, і, урэшце, не абы-якое мастацтва фота. Мне рэдка даводзілася бачыць лепшыя фатаграфіі, чам, скажам, ягоныя "Партызанская маці" або "Палюбоўніца грому". На першай стаіць на пожні, "падперазаўшыся" сярпом, жанчына. Рукі — як сасновая кара. Вочы бачылі ўсё (і-ох, як многа страшнага!). На другой — каравае дрэва, наскрозь пашчапанае, прабітае перуном, усё ў дыме. І наводдаль адступаюць хмары.

Бацька Валодзеў памёр за чатыры гады да таго, як мы наведалі тую магілу. А быў піцерскі рабочы, а пасля плытагон. І ў вайну, у страшную блакаду 43-га года, выратаваў брыгаду, завёўшы яе ў такія сівыя нетры, што немцы не здолелі сунуцца і не знайшлі людзей.

П.А.Жалезняковіч глядзеў і ўспамінаў. Яму, камісару, не раз даводзілася выступаць на могілках. Кожнага ведаў, кожнага помніў у твар. І жывога і, пасля, мёртвага.

І вось мы сядзелі і ўспаміналі спачатку бацьку, пасля сына. І разважалі, што помнікі трэба ставіць не толькі тым, хто трапна страляў, а і тым, хто ладна і ў час умеў выратаваць. Тым больш — такое вялікае мноства людзей.

А я яшчэ думаў, што помнік гэтаму чалавеку ўсё ж пастаўлены. Літаратурны. Аповесць "На Быстранцы", дзе ён — дзед, спісаны з натуры, жыўцом.

Пасля гэтага нашага малога падарожжа я і пачаў крыху іначай глядзець на Валодзю. Адбыўся як бы некаторы пералом у маіх поглядах на яго. Што я ведаў раней? Ведаў аб ягонай "партызанцы", ведаў, чаго яна яму каштавала (урэшце, лепей за

ўсё сказаў пра гэта ён сам), ведаў аб дужа цяжкай і дужа плённай працы ягонай у Брэсцкім педінстытуце, чытаў ягоныя кнігі, лавіў з ім рыбу…

А тут прыйшло разуменне асяроддзя, у якім чалавек нарадзіўся і вырас. Я ўбачыў "на свае вочы" пейзажы, на якія з дзяцінства глядзелі вочы ягоныя. Я знаёміўся, я размаўляў з людзьмі, з якімі рос, размаўляў, спрачаўся і мірыўся ён. Бачыў і тую пушчу, і тую малую белую каплічку, ля якой ён рабіў засаду на паліцаяў. Бачыў, урэшце, хату ў Крынках і магілу. Тую, дзе адліты ім барэльеф.

Прыйшло разуменне чалавека знутры, калі ты ведаеш і любіш ягоны свет. І тады, на гэтым выпадку, я разумеў, што пісьменнік, калі ён пісьменнік, нават калі ён і вывучыў усе дакументы, не можа напісаць — ну, скажам, пра Каліноўскага, калі не пабываў у ціхай зялёнай Свіслачы і ў пецярбургскіх змрочных кутах часоў Дастаеўскага, і на полі бою пад Мілавідамі, і ў шэрых Святаянскіх мурах, і ў Дамініканскай турме, і, урэшце, на Лукішках.

Хай там мала чаго асталося з тых часоў — само паветра мясцін падкажа табе найбольшае, якое магчыма між людзей, разуменне чужой душы, яе парываў і патаемных думак, яе гісторыі.

Цяпер я ведаю, што ёсць у майго сябра рысы характару бацькі і навакольных людзей. І нервовасць, і ўпартасць, і цвёрдасць чалавека, які не адступіць і не саступіць. І гэтая бацькава страсць да незалежнасці. І адначасова залежнасць ад вялікага свету паэзіі, да якога ён належыць не толькі душою, але і ўсім існаваннем сваім.

З чаго нараджаецца сімпатыя? Можна назваць не адзін выпадак, калі за некалькі дзён сімпатыя можа перарасці ў моцнае сяброўства. Я не кажу пра выпрабаванні, вайну, выпадкі незвычайнай, дужа вялікай і ахвярнай узаемадапамогі. Я кажу пра звычайнае, будзённае жыццё.

Такі выпадак — падарожжа з бясконцай зменай уражанняў і павышаная ўразлівасцю асоб, што прымаюць у ім удзел, з поўнай іхняй свабодай ад абавязкаў, акрамя абавязкаў самога падарожжа.

У мяне такіх падарожжаў з Валодзем Калеснікам было шмат, і я шкадую толькі, што не ўдзельнічаў тады ў ім з Янкам Брылём падарожжы на веласіпедах.

Валодзя выключна фатаграфаваў ужо і тады. Часам я перабіраю гэтыя здымкі; як жывыя, мы зноў сядзім з ім на копцы Міцкевіча і прадзіраемся праз джунглі Варанчанскіх могілак, каб адшукаць помнік белага мармуру — "самай прыгожай дзяўчыне навакольля"; і разам залазім у гмах васьмісотгадовага дуба пад Варончай, у чорны выпалены "пакой" у ім.

Мы ў Малой Кракотцы, у сябра-настаўніка, дужа добрага чалавека. Малая Кракотка — адна з найпрыгажэйшых вёсак, што мне давялося бачыць за ўсё жыццё.

…Тэраса з завесамі зеляніны. Шаты дрэў. Ну і гасціннасць. І, вядома ж, амлет. У нас, у Прыдняпроўі, на такую цвёрдую сялянскую яечню кажуць: "Як лапаць. Можна на сук павесіць, і будзе вісець". Гэта мы лынды б'ём. А Валодзя працуе. І тут працуе. Збірае матэрыялы. І настаўнік наш патрэбен зараз яму як аднакласнік яго героя.

І мы ідзём у лес, настолькі густа засеяны суніцамі, што зялёнага менш за чырвонае. Тут кракоцкія сяляне збіраліся на маёўкі "за польскім часам". І настаўнік расказвае, а "пану Калесніку" не да суніц, бо ўвесь час бегае па старонках блакнота ягонае пяро.

Так дзень за днём. І так, якраз тады, стваралася цудоўная кніга пра Валянціна Таўлая.

…А вось Андрэевіч, не дужа яшчэ ўмеючы круціць баранку, ледзь не звaліўся з яра ў Нёман, і мы падпіраем машыну, і ногі нашы слізгаюць на цудоўным, высокім разнатраўі нёманскага поплаву. І мы ледзь не налажылі ў той Нёман галавой, а пасля стаім, збялелыя, і тупа лаем невядома каго і што.

Ці едзем у Белавежу з харошым хлопцам, настаўнікам з прыпушчанскай вёскі. Яшчэ халаднавата, і на мне пазычаная ў Валодзі безрукаўка. У памяці і Камянецкая вежа, і абшар з яе вышыні, і тое, як нечакана, выйшаўшы з-за выварaтня, наляцелі на мілае відовішча — зубрыную сямейку за тры крокі ад нас. І ўцякаць няма куды.

…Рэзкі бярозавік у леснічоўцы на Свіцязі. Мы з Уладзімірам Калеснікам сядзім у чоўне паміж небам і зямлёй, і нязменны яго шэры берэт ссунуты на самую патыліцу. І маўчым, і добра нам, як ніколі, бо мы ўсё разумеем у сабе і адзін у адным, а вуды нашы перакрэсліваюць захад.

Або як ездзілі ў 1968 годзе па вёсках Брэсцкага і Пружанскага раёнаў. У Дзмітровічы, у Харава, дзе чыталі вершы, дзе паднеслі нам дзеці каравай "на волата" — зараз і партызанскай ротай не з'ясі…

А рыба на Лясной. Ён і дагэтуль не ведае, што гэта не я, наступіўшы, зламаў таду яму цудоўнае вудзільна. Мусіў згадзіцца, што гэта я, бо на сябра асабліва крычаць не будзеш.

Я люблю бываць і досыць часта бываю ў яго хаце. І, вядома ж, у Брэсцкім інстытуце, дзе ён заваяваў агульную любоў студэнтаў. Рэдка мне даводзілася бачыць так добра абладнаны кабінет беларускай мовы і літаратуры. Хай небагата, але з цеплынёй, веданнем справы і любоўю да яе, з уніклівасцю вучонага і азартам

паэта, з усім: ад частых пісьменніцкіх выступленняў да магнітафонных запісаў.

…Зноў дом, і гарачыя спрэчкі, і размовы аб кнігах, раптоўны рогат, калі ўспомнілі, як сядзела на каменнай агароджы інстытута малпа (уцякла з інстытуцкага звярынца) і дражніла служачага, што хацеў яе ўзяць, і натоўп разявак, якія не бачылі такой звычайнай істоты, такой з'явы, як малпа на брэсцкім плоце.

…Ну вось. Усё тут атрымалася ўрыўкамі. Урэшце, як і ўсё жыццё. Але ж гэта не крытычны артыкул. Я наношу на паперу штрыхі, ствараючы накід партрэта. Партрэта, які нехта колісь вылепіць ці напіша куды больш спакойна, куды больш выгаблевана, чым я.

…І яшчэ адзін успамін. Чэрвень 1971 года. Зноў сцелецца пад колы дарога. Едзем. Янкам і Валодзем ужо зроблены выключны (на жаль, кепскавата зроблены паліграфічна) альбом пра мясціны Міцкевіча. Але яны, па-мойму, яшчэ не прыступалі да чарговай сваёй агульнай работы: з магнітафонам, блакнотам і фотаапаратам аб'ездзіць спаленыя ў вайну вёскі. Каб на старонках былі нявыдуманыя апавяданні, непрыхарошаныя абліччы, каб з пласцінак гучалі са слязьмі і з гневам галасы дзівам уцалелых людзей. Што ж, калі гэта будзе створана — гэта і будзе тое, што называецца служэннем айчыне і ісціне.

Тады была апошняя наша сустрэча з Паўлам Арсенавічам Жалезняковічам. Ён памёр на кастрычніцкія святы таго ж года. Сядзелі ў садзе. Вялізныя яблыні распасціраліся шырока, раскошна і цяніста. На іх была ўжо завязь.

Дужа хворы, спрацаваны чалавек сядзеў на лаве, склаўшы маршчакаватыя рукі. Гаварылі. Я і тут бачыў, што галава Валодзева працуе. Запамінае. Такі ўжо грунт яго адносін з людзьмі. Таму што, у сваю чаргу, без памяці аб былой барацьбе, былых здзяйсненнях, былых няшчасцях не можа быць дабрыні да людзей.

На гэты раз запісваў і я. Пра ўдзел у КПЗБ хлопцаў-украінцаў. Шкада, што Павел Арсенавіч не ўбачыць гэтых старонак мае кнігі для Украіны пра Беларусь.

Я неяк зусім па-іншаму, не так, як раней, глянуў на вёску, куды мы прыехалі нейкай, можа, гадзінай пазней. Крынкі Карэліцкага раёна.

Сіняўку тры разы палілі немцы. Бацьку Валодзевага пасля вайны перавялі загадчыкам вадзянога млына — за дваццаць ад Сіняўкі кіламетраў — сюды, у Крынкі. Тут і дагэтуль жыве Валодзева мачыха. Бацька дзесяць год як памёр, а яна з Валодзем дружыць. Сапраўды, сябры і родныя людзі.

Хата. Сакавітыя лопухі — сцісні, і пырсне сок. Над хатаю ў

вялікім садзе волат-каштан.

Вакол узгоркі над Сервеччу. І ўсё мы з Жэнем Крымком, былым партызанам і выключным чалавекам, ідзём высока над звівамі Сервечы па ўрвішчах, і вакол далеч, якую рэдка бачыць свет, і Крымко ўгаворвае нас пасяліцца тут, у Беражне, вёсцы, якую як пашукаць, то і не знойдзеш.

А што?

Спалілі хату, вёску, пазбавілі роднага дому. Думалі, што не будзе куды прыйсці? Але адбудуецца новае гняздо, і заўсёды будзе куды з'явіцца нам на нашай зямлі.

Астануцца не адны ўспаміны аб старой хаце. Астанецца і другая, куды можна прыйсці як у сваю, калі захочацца прыпасці да зямлі або проста паляжаць на мурагу і падумаць. Нічога. Таптаць нам гэтыя шляхі ў полі яшчэ незлічоную колькасць год.

…Стаім над Сервеччу. Набліжаецца, насоўваецца навальніца. Грувасцяцца і глубяцца хмары, цяжка перавальваецца ў іх пярун.

…Стаім на зямлі, якая і Валодзю, і Янку, і іншым сябрам была і будзе вельмі дарагая.